ЧАМУ Ў ЕЎРОПЕ БАСТУЮЦЬ ФЕРМЕРЫ 7

ВЯСЕЛЛІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 148 (29770)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

КАРАТКА

- Пасылкі да кілаграма праз «Белпошту» з 1 жніўня можна будзе адправіць за Br3.
- **Паломнікі пройдуць з Віцебска ў Смаленск да цудатворнага абраза Божай Маці.**
- «Белавія» ўводзіць дадатковыя рэйсы ў Санкт-Пецярбург.
- **Беларусь адклікала свайго пасла з Вялікабрытаніі.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван КРУПКО, старшыня Гомельскага аблвыканкама:

«У цэлым эканоміка Гомельскай вобласці ў першым паўгоддзі спрацавала стабільна. Праведзена работа па дыверсіфікацыі экспартных паставак, замяшчэнні імпартных матэрыялаў і камплектуючых. Гэта дае магчымасць забяспечваць рытмічную работу прадпрыемстваў, а таксама паступленне падаткаў для выканання сацыяльных абавязацельстваў. Страты ад экспарту нашай прадукцыі ў недружалюбныя краіны шэрагам прадпрыемстваў часткова кампенсуюцца за кошт асваення новых рынкаў, асабліва расійскага. У цэлым экспартныя пастаўкі за пяць месяцаў у Расійскую Федэрацыю павялічыліся на 23 працэнты да аналагічнага перыяду мінулага года. Аналагічна і для будаўнічага комплексу. Нашы будаўнікі ўжо распачалі ў Расіі ўзвядзенне жылых дамоў і розных сацыяльных аб'ектаў. Звяртаем увагу таксама на ўзрастаючую ў свеце значнасць сельскай гаспадаркі, на прадукцыю якой фіксуецца павышаны попыт на знешніх рынках».

ISSN 1990 — 763X

«Усё павінна быць сваё. Калі мэту паставілі — будзе»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочай паездкай наведаў Слуцкі раён і ААТ «Казловічы-Агра». На парадку дня — сельская гаспадарка, у прыватнасці, ход уборачнай кампаніі. Кіраўніку дзяржавы далажылі, што на гэты момант убрана 13 працэнтаў плошчаў, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых большая, чым летась, ва ўсіх абласцях. Па словах міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара Брыло, з улікам вынікаў гэтага года плануецца істотна павялічыць плошчы пасеваў азімага ячменю, які сёлета паказвае добрыя вынікі.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што важна «не забалбатаць» тэму азімага ячменю. «Для нас азімы ячмень — выратаванне. Ён трапляе ў той перыяд вегетацыі, калі ёсць нейкая вільгаць. Асабліва ў паўднёвых раёнах. У Гомельскай вобласці трэба спрабаваць, калі вільгаці не хапае», — растлумачыў ён. Такім чынам, азімы ячмень можна ўбіраць раней, чым іншыя збожжавыя каласавыя культуры, і больш раўнамерна задзейнічаць тэхніку. І хоць гэтая культура няпростая і патрабавальная, але пры правільным тэхналагічным падыходзе можна разлічваць на высокі ўраджай. Напрыклад, на прэзідэнцкіх палях сёлета ўраджайнасць каля 80 ц/га. І аналагічны вынік у ААТ «Казловічы-Агра». Налета пасевы азімага ячменю тут плануюць значна пашырыць.

«З усіх пазіцый азімы ячмень трэба апрацоўваць. У савецкія часы па-наплявацельску да гэтага ставіліся. Цяпер і тэхналогіі, і тэхніка, і людзі іншыя. Мы проста можам атрымліваць добрыя ўраджаі. Дык трэба смялей спрабаваць. Але павінен быць разумны баланс, каб у выпадку нізкай ураджайнасці з прычыны дрэнных умоў надвор'я дабрацца збожжавы палетак за кошт іншых культур», — падкрэсліў Прэзідэнт. Разам з тым, па яго словах, не трэба прымушаць гаспадаркі засяваць пэўныя плошчы азімым ячменем. Яны павінны самі вызначыцца з улікам вопыту, колькі апрацоўваць гэтай культуры.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што калі строга выконваць усе тэхналогіі вырошчвання каласавых і збожжавых і атрымліваць высокую ўраджайнасць, то можна ў будучым сеяць менш збожжа, выдзяляць больш плошчаў пад бялковыя культуры. Гэта важна для жывёлагадоўлі, якой патрэбная якасная кармавая база. Таксама гэта дазволіць сэканоміць значныя сродкі на закупку імпартнага бялку. Прэзідэнт арыентуе сельгаспрадпрыемствы максімальна забяспечваць патрэбнасці ў кармах і збожжы для жывёлагадоўлі, у тым ліку браць і асвойваць дадатковыя землі. «Можна разважаць, што калі ёсць грошы, то за мяжой можна купіць. Але ты вывез грошы з краіны, а не інвеставаў грошы ў сваю сельскую гаспадарку. Таму трэба развіваць сваю. І гэта павінна быць на кантролі. Міністэрства (сельскай гаспадаркі і харчавання) тое дакладна павінна кантраляваць... Гэта вельмі важнае пытанне цяпер. А то мы капейкі шукаем, каб укласці ў нейкія стратныя (прадпрыемствы), а сотні мільёнаў долараў вывозяць за межы краіны», — сказаў ён.

СТАР. 2

Жніво-2022

ДА АПОШНЯГА ЗЯРНЯТКА

Як у Магілёўскай вобласці наладжаны кантроль за ходам уборачнай

Харчовая бяспека сёння актуальная ва ўсім свеце. А ва ўмовах санкцый і абвостранай палітычнай абстаноўкі актуальнасць нарыхтоўкі ўраджаю і захаванне яго да кожнага зярнятка становіцца справай першай неабходнасці. Пасля селектарнай нарады Прэзідэнта накіроўваюся ў рэйд з супрацоўнікамі міліцыі. У складзе рабочай групы УУС Магілёўскага аблвыканкама, у якую ўваходзяць супрацоўнік упраўлення барацьбы з эканамічнымі злачынствамі, інспектар ДАІ і прадстаўнік упраўлення Дэпартамента аховы правапарадку і прафілактыкі, едзем у Крычаўскі раён.

Нявыдуманыя гісторыі

Уборачная на Магілёўшчыне пакуль больш звязана з нарыхтоўкай кармоў, а вось масавае жніво яшчэ наперадзе. Калі едзеш міма залатых палеткаў, сэрца радуецца: гэта ж сапраўднае багацце. Па дарозе ў Крычаў спадарожнікі згадалі шмат прыкладаў, як нядобрасумленныя грамадзяне спрабавалі незаконна зарабіць на народным багацці.

СТАР. 5

Навука на службе

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА ЎРАДЖАЮ

Развіццё сельскай гаспадаркі ў сучасным свеце — сплаў працы навукоўцаў і аграрыяў

Высокаэфектыўныя ўгнаенні з бытавых адходаў, адраджэнне чырвонай пароды кароў, выкарыстанне дронаў для барацьбы з хваробамі раслін і ўнікальныя лекі з казінага малака... Развіццё раслінаводства і жывёлагадоўлі і ў цэлым эканамічная эфектыўнасць сельскагаспадарчай галіны цесна звязаныя з дасягненнямі навукі. Уклад беларускіх навукоўцаў у развіццё сельскай гаспадаркі абмеркавалі ў Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 4

Высокіх абаротаў і добрых продажаў

Заўтра — Дзень работнікаў гандлю

Работнікаў і ветэранаў гандлёвай галіны з прафесіянальным святам павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«У гэтай важнай сферы сёння працуе больш як 630 тысяч чалавек — кампетэнтных, добрасумленных і адказных прафесіяналаў, якія не толькі захоўваюць традыцыі, закладзеныя ветэранамі, але і пастаянна імкнуцца да новых высокіх стандартаў, прапаноўваючы жыхарам і гасцям краіны ўсё больш тавараў і паслуг», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галіна гандлю паступова развіваецца: з'яўляюцца новыя гандлёвыя аб'екты і рабочыя месцы, расце яе ўклад у ВУП і напаўненне бюджэту.

«Перакананы, выбраны курс на павелічэнне долі айчынных тавараў і імпартазамяшчэнне, павышэнне якасці абслугоўвання і ўкараненне сучасных лічбавых тэхналогій, развіццё гандлю ў вёсцы і ўдзел у сацыяльных праектах дапаможа вам і ў далейшым заставацца адным з драйвераў айчыннай эканомікі. Няхай шчырая падзяка пакупнікоў заўсёды будзе залогам вашага выдатнага настрою», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў работнікам гандлёвай галіны моцнага здароўя, высокіх абаротаў і добрых продажаў.

«Усё павінна быць сваё. Калі мэту паставілі — будзе»

ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫНІК

Не засталася без увагі тэма рэгулявання цэн на прадукцыю аграпрамысловых прадпрыемстваў. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў цяперашніх умовах разам з імкненнем забяспечыць максімальна высокі прыбытак ад рэалізацыі вырабленай сельгаспрадукцыі, у тым ліку і на знешнім рынку, нельга забываць і аб сацыяльным аспекце, унутраным рынку, інтарэсах дзяржавы. «Надбаўкі даём? Крэдыты даём таннейшыя? Яны «вялікія»... «Мы ў Расію завязём, там даражэй». Гэта што, яны рынак забяспечылі? Гэта дзяржава рынак забяспечыла», — задаў рытарычныя пытанні Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар пацікавіўся тэмпамі росту аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі ў цэлым па краіне і тым, як рэалізоўваюцца планы па павелічэнні ВУП галіны на чатыры працэнты ў параўнанні з узроўнем мінулага года. Было даложана, што сёлета пакаязчыкі па ўраджаі збожжавых культур будуць лепшыя за ранейшыя, набірае абароты вытворчасць малака. У птушкагадоўлі і свінагадоўлі, дзе раней назіраліся праблемы, ужо выходзяць на стабільную работу.

Пасля прыезду ў гаспадарку ў Слуцкім раёне Аляксандр Лукашэнка найперш падрабязна распытаў кіраўнікоў, як і за кошт чаго плануецца забяспечваць далейшы прырост, акцэнтаваў увагу на неабходнасці інтэнсіфікаваць вытворчасць. Ён падкрэсліў, што ААТ «Казловічы-Агра» — моцнае прадпрыемства, але яно недастаткова загружана. «Галоўнае — у сярэднетэрміновай перспектыве павялічыць удвая пагалоўе буйной рагатай жывёлы і дойнага статка. У гэтым тваё выратаванне і рэнтабельнасць», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да кіраўніка прадпрыемства.

Побач з полем азімай пшаніцы Прэзідэнт агледзеў новы малочнатаварны комплекс «Лесуны», пабудаваны пераважна за ўласныя сродкі прадпрыемства. Комплекс быў уведзены ў эксплуатацыю ў чэрвені гэтага года. На ферме змяшчаецца 10 працэнтаў пагалоўя асноўнага статка пры праектнай магутнасці 800 галоў і з перспектывай павелічэння да 1,5 тысячы. Абмяркоўваючы з падачы губернатара Мінскай вобласці Аляксандра Турчына тэму фінансавання і падтрымкі далейшага будаўніцтва падобных комплексаў у іншых гаспадарках, Прэзідэнт адзначыў, што такая падтрымка павінна быць выбарачнай — там, дзе ёсць перспектывы і можна разлічваць на добрую аддачу. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў такіх гаспадарках павінен быць вынік.

Прэзідэнт агледзеў комплекс, абмеркаваў з кіраўнікамі практычныя аспекты далейшай работы. «Гэта добры варыянт. Калі ён аптымальны па грашах, гэта добры варыянт», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, перспектывы ляжаць у тым ліку і ў рэчышчы далейшага ўкаранення тэхналогій, рабатызацыі працэсаў, што ў выніку дае большую рэнтабельнасць і патрабуе менш працоўных рэсурсаў, пошук якіх месцамі ўскладнены. Яшчэ адзін момант — неабходнасць павышэння ўзроўню патрабавальнасці па ўсёй кадравай вертыкалі на месцах, каб кіраўніцтва добрых гаспадарак не расхалоджваць прыкладам работы больш слабых. «Гэтага дапускаць нельга», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка станоўча ацаніў гаспадарскі падыход кіраўніцтва прадпрыемства да будаўніцтва жывёлагадоўчых памяшканняў. Многае робіцца гаспадарчым спосабам, што ў тым ліку эканоміць сродкі. У тым жа рэчышчы ляжаць патрабаванні Прэзідэнта і ў сферы імпартазамяшчэння.

«Усё павінна быць сваё. Калі мэту паставілі — будзе», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што гэта датычыцца не толькі канкрэтнага прадпрыемства або сельскай гаспадаркі, але і іншых сфер.

«Дзякуй. Не дарэмна прыехаў», — сказаў на завяршэнне Прэзідэнт.

Валерыя СЦЯЦКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па законе

НОВЫ ПРОФІЛЬ МУЗЕЯЎ І ВІРТУАЛЬНЫЯ КАРЫСТАЛЬНІКІ БІБЛІЯТЭК

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Лілія КІР'ЯК аб змяненнях у Кодэксе па культуры

У канцы чэрвеня бягучага года Палатай прадстаўнікоў быў прыняты праект «Аб змяненні законаў па пытаннях культуры». Наваўвядзенні адбыліся практычна ва ўсіх сферах культуры, але асноўныя датычацца аховы гісторыка-культурных каштоўнасцяў, арганізацыі і правядзення культурных мерапрыемстваў, дзейнасці творчых саюзаў, а таксама бібліятэчнай і музейнай справы. Каб зразумець, якім чынам змяненні ў Кодэксе паўплываюць на звычайных грамадзян, «Звязда» звярнулася да Ліліі Кір'як, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

— Карпатлівая аналітычная работа па пошуку шляхоў удасканалення нормаў Кодэкса вялася да апошняга. Шмат якія папраўкі выпрацоўваліся на пасяджэннях рабочай групы пры абмеркаванні прапаноў, у тым ліку тых, што паступілі ад дэпутатаў. У ходзе карэкціроўкі дакумента істотна павялічыўся яго аб'ём — з 48 старонак да 70, — адзначыла Лілія Кір'як.

Камісіяй былі прыняты папраўкі, датычныя дзейнасці музеяў, у прыватнасці толькі штатныя музейныя супрацоўнікі могуць праводзіць экскурсіі ў музеях.

— З улікам развіцця лічбавых і сучасных тэхналогій было прынята рашэнне замацаваць новы профіль музеяў — навукова-тэхнічны, да якога адносяцца музеі прамысловасці, транспарту, сувязі, машынабудавання і іншыя. Актуалізуючы нормы закона, мы ўвялі новую катэгорыю наведвальнікаў, якая цяпер замацавана тэрмінам «віртуальны, або аддалены наведвальнік». Паняцце «віртуальны карыстальнік бібліятэк» датычыцца і бібліятэчнай справы, — распавяла Лілія Кір'як.

Згодна са змяненнямі Кодэкса, больш магчымасцяў з'явіцца ў творчых саюзаў. Напрыклад, акрамя творчай дзейнасці яны могуць займацца культурнай дзейнасцю па іншых напрамках, а мастакі змогуць пражываць у сваіх творчых майстэрнях, студыях і іншых памяшканнях на перыяд ажыццяўлення творчай дзейнасці. Дамы рамёстваў атрымліваюць права прадаваць свае вырабы падчас правядзення не толькі культурных, але і іншых мерапрыемстваў.

— Шмат паправак было ўнесена ў арганізацыю і правядзенне культурна-відовішчных мерапрыемстваў, у асаблівасці тых, што ладзяцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. У выпадку калі мерапрыемства ладзіцца без мэты атрымання прыбытку, арганізатарам трэба атрымаць пасведчанне на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, але без выплаты пошліны. Акрамя таго, юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік, якія займаюцца правядзеннем культурна-відовішчных мерапрыемстваў, павінны быць уключаны ў спецыяльны рэестр арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, — дадала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы. Таксама Лілія Кір'як звярнула ўвагу, што для арганізацыі і правядзення выставак уводзіцца паведамляльны прынцып.

Унесена дакладнасць і ў парадак арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў у выпадку іх адмовы або адмены. У якасці прыкладу — адмена канцэрта. Кодэксам устаноўлены не толькі тэрміны, на працягу якіх пакупнік квіткоў можа атрымаць свае сродкі, а таксама і спецыяльныя месцы, дзе здзяйсняецца вяртанне грошай: «Інтарэсы грамадзян перш за ўсё», — адзначае намеснік старшыні Пастаяннай камісіі.

Змяненні закранулі і парадак вывазу матэрыяльных культурных каштоўнасцяў, якія не прадугледжаны міжнародна-прававымі актамі, што складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза. Так, калі чалавек набывае, напрыклад, карціну і хоча вывезці яе за мяжу, яму не трэба ісці ў Міністэрства культуры, як гэта было раней. Дастаткова звярнуцца ў мясцовыя органы. Папраўка ўведзена з мэтай папулярызацыі айчыннай культуры і мастацтва за межамі нашай краіны.

Дэпутат акцэнтавала ўвагу на тым, што права выканкамаў абласнога ўзроўню надаваць культурнай каштоўнасці, якая мае рэгіянальную значнасць, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама пазбаўляць такога статусу, цяпер перададзена Міністэрству культуры.

Таксама Кодэксам устаноўлены пэўны памер сродкаў знадворнай рэкламы, якія размяшчаюцца на помніках архітэктуры.

— Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, абавязкі грамадзян у сферы культуры дапоўніліся абавязкам захоўваць гістарычную памяць аб гераічным мінулым беларускага народа — лічу гэта вельмі важнай папраўкай, — звярнула ўвагу Лілія Кір'як.

Арына КАРПОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША дабудуюць участак «сцяны Трампа» на граніцы з Мексікай

Адміністрацыя амерыканскага прэзідэнта Джо Байдэна дазволіла дабудаваць сцяну ў штаце Арызона на граніцы з Мексікай, паведамляе ТАСС са спасылкай на інфармацыю Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША.

Узвядзенне амерыкана-мексіканскай сцяны пачалося яшчэ пры мінулым прэзідэнце ЗША Дональдзе Трампе, таму ў СМІ аб'ект называлі «сцяна Трампа». Будоўля выклікала шмат спрэчак. Кантраляваць будаўніцтва будзе Служба мытнага і пагранічнага кантролю. Сцяну дабудуюць у раёне плаціны Марэлас (акрузе Юма), каб абараніць чатыры ўчасткі пагранічнага бар'ера. Пры гэтым у ведамстве адзначылі, што такім чынам яны хочуць засцерагчы мігрантаў, бо каля гэтага ўчастка працякае імклівая рака Каларада. Па іх сцвярджэнні, нелегальныя мігранты могуць патануць у рацэ або быць траўміраванымі. Дональд Трамп, з'яўляючыся прэзідэнтам ЗША, значна ўзмацняў жорсткасць міграцыйнай палітыкі, прымаў рашэнні па ўзмацненні пагранкантролю. Яму належыць і ініцыятыва па будаўніцтве амерыкана-мексіканскай сцяны, якая была заклікана спыніць нелегальную іміграцыю і кантрабанду наркотыкаў.

Грэнландыя страціла 18 мільярдаў тон лёду за тры дні з-за анамальнага надвор'я

З-за анамальна цёплага надвор'я Грэнландыя страціла значную долю запасаў лёду. Пра гэта паведамляе Gizmodo.

На працягу некалькіх дзён у пачатку ліпеня ў Грэнландыі было горача. Згодна з CNN, у некаторых частках краіны тэмпература вагалася ў раёне 15,5 градуса, што больш як на 10 градусаў перавышае ліпеньскую кліматычную норму. Гэтыя незвычайна высокія тэмпературы выклікалі шырокамаштабнае раставанне снегу і лёду на ледзяным шчыце Грэнландыі. Усяго за тры дні, з 15 да 17 ліпеня, ледзяны шчыт страціў каля 18 мільярдаў тон вады. Затым раставанне стала яшчэ мацнейшым. У перыяд з 20 да 23 ліпеня ледзяны шчыт губляў ад 8 да 10 мільярдаў тон вады ў дзень, заявіў Тэд Скамбас з Універсітэта Каларада. Вада, якая растае, зносіла з сабой і вялікую масу ледніковай гразі, што добра відаць на спадарожнікавым здымку. На мінулым тыдні тэмпы раставання лёду запаволіліся і наблізіліся да кліматычнай нормы, але гэты ўсплёск усё роўна выклікае турботу ў кліматолагаў. Калі ж у Грэнландыі растане ўвесь лёд, узровень мора паднімецца прыкладна на восем метраў.

Вытворчасць аўтамабіляў у РФ знізілася на 89 % у чэрвені

Выпуск легкавых аўтамабіляў у чэрвені 2022 года знізіўся на 89 % у параўнанні з тым жа месяцам мінулага года, паведамляе ТАСС са спасылкай на даныя Расстата.

Усяго за месяц у краіне было выраблена 13,4 тысячы легкавых машын. Па выніках паўгоддзя вытворчасць легкавых аўтамабіляў у краіне знізілася амаль на 62 працэнты — да 281 тысячы адзінак. Выпуск грузавікоў па выніках шасці месяцаў знізіўся ў Расіі амаль на 18 %: са студзеня да чэрвеня выраблена 70,4 тысячы такіх машын, з іх у чэрвені — 10,3 тысячы, што на 40 % менш, чым у тым жа месяцы 2021-га. Канвееры большасці расійскіх аўтазаводаў, якія выпускаюць легкавыя аўтамабілі, былі спынены вясной 2022 года. У чэрвені АўтаВАЗ аднавіў вытворчасць аўтамабіляў Lada Granta ў спрошчанай камплектацыі. Большая частка заводаў, якія належаць замежным аўтакампаніям, па-ранейшаму знаходзіцца ў прастоі. У прыватнасці, напярэдадні крыніцы «Газеты.Ru» паведамілі, што канцэрн Volkswagen рыхтуе да продажу свой завод у Калузе, прадпрыемства наведалі дэлегацыі патэнцыяльных пакупнікоў. У самой кампаніі адзначылі, што канчатковых рашэнняў аб лёсе завода не прынята.

Шануй сваё

Звыш 72 тысяч замежнікаў адпачыла сёлета ў беларускіх санаторыях

Але большасць гасцей у здраўніцах — беларусы

Сезон у беларускіх санаторыях у самым разгары — цяпер тут адпачывае каля 25 тысяч чалавек. Усё большую цікавасць айчынныя здраўніцы заваёўваюць у замежнікаў, у прыватнасці ў гасцей з Расіі. Колькі каштуюць суткі такога водпуску і ці сапраўды ён атрымаецца таннейшым, чым у Турцыі ці Егіпце, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.

З МАКСІМАЛЬНАЙ ЗАГРУЗКАЙ

Паводле слоў суразмоўніка, санаторна-курортныя ўстановы цяпер працуюць з максімальнай загрузкай. Штодзень тут знаходзіцца каля 25 тысяч адпачывальнікаў, з іх 5,5 тысячы — замежнікі. Большасць апошніх (95 %) — расіяне. Але геаграфія гасцей нашых санаторыяў вельмі шырокая — гэта прадстаўнікі амаль чатырох дзясяткаў краін.

— У нас адпачываюць і грамадзяне ЗША, Нідэрландаў, Кітая, Аўстраліі. Вядома, іх адзінкі, і можна меркаваць, што яны пераважна выхадцы з краін былога Саюза. Нягледзячы на рыторыку Прыбалтыкі, Беларусь лібералізуе ўмовы для ўезду, і штодзень у нашых санаторыях знаходзіцца каля 100 гасцей з краін Балтыі, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

Колькасць замежных грамадзян у нас на адпачынку сёлета, дарэчы, павялічылася на 40 % у параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года. У беларускіх санаторыях у 2022-м ужо адпачыла больш за 72 тысячы замежнікаў, а выручка ад экспарту паслуг павялічылася на 60 % і складае 82 мільёны рублёў.

У цэлым па выніках першага паўгоддзя запаўняльнасць беларускіх здраўніц вырасла на 6 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года і складае больш за 75 %. Выручка ад аказання паслуг павялічылася амаль на 30 % і складае 368 мільёнаў за паўгоддзе.

— Калі і за другое паўгоддзе мы атрымаем такую ж выручку, то перавысім на 15-20 % вынікі мінулага года, — удакладняе Генадзь Балбатоўскі. — А чаканні ў нас на асенні сезон аптымістычныя. Мы бачым павелічэнне глыбіні продажаў. Верасень забраніраваны на 90 %. У некаторых санаторыях ёсць браніраванне да Новага года. Аднак эпідэмічную сітуацыю нельга спрагназаваць. Няпэўнасць будзе захоўвацца, але, мяркую, вынікі работы сістэмы будуць лепшымі, чым летась.

Што датычыцца абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы санаторыяў, то яна ідзе апераджальнымі тэмпамі. Здраўніцы ўкладваюць сродкі ў сваё развіццё пастаянна. За першае паўгоддзе яны выдаткавалі на мадэрнізацыю больш за 80 % сродкаў, запланаваных на год.

ТАННЕЙ, ЧЫМ У ТУРЦЫІ І ЕГІПЦЕ

Звярнуў увагу суразмоўнік і на цэны:

— Сёння бытуе меркаванне, што танней злятаць у Турцыю ці Егіпет, чым знаходзіцца ў беларускіх санаторыях. Я абвергну гэта. Мы вывучылі прапановы турыстычных фірмаў па Егіпце і Турцыі. У сярэднім кошт сутак у двухмесным стандартным нумары ў атэлях Турцыі складае больш за 230 рублёў, Егіпта — каля 198 рублёў. На сёння, паводле маніторынгу дзейнасці нашых санаторна-курортных устаноў, сярэдні кошт знаходжання складае каля 80 рублёў. Безумоўна, калі параўноўваць цэны ў санаторыях вышэйшай катэгорыі ў нумарах паўлюкс і люкс, то цана аднаго дня будзе супастаўная. Але ў цэлым даступнасць санаторыяў ёсць як для беларусаў, так і для замежнікаў.

Пры гэтым Генадзь Балбатоўскі падкрэсліў, што трэба размяжоўваць паняцці адпачынку, аздараўлення і лячэння. У беларускіх здраўніцах адпачывальнікі атрымліваюць увесь спектр медыцынскіх і аздараўленчых працэдур. І больш за 90 % гасцей якраз набывае такія паслугі, дзе прысутнічае медыцынскі складнік.

Што датычыцца работы беларускіх санаторыяў у краінах Балтыі, то санаторый у Друскінінкаі працуе стабільна — прымае і аздараўляе грамадзян краін ЕС, штодзень там адпачывае каля сотні чалавек па камерцыйных пуцёўках.

— Грамадзян Беларусі мы не можам туды накіроўваць, бо ўрад Літвы з сакавіка не дае візы. Да 15 верасня гэтыя абмежаванні падоўжаны. Таму пакуль мы прапанавалі магчымасць там адпачыць бацькам і дзецям, якія маюць візы. Каля 40 дзяцей-інвалідаў і яшчэ каля 50 дзяцей і бацькоў 8-10 жніўня паедуць туды. Далей паглядзім, як будуць развівацца падзеі з візавай падтрымкай, — удакладніў Генадзь Балбатоўскі. — Напэўна, многія бачылі зварот мэра Друскінінкая ў МЗС Літвы даць магчымасць папраўліць здароўе і прайсці рэабілітацыю беларускім дзецям-інвалідам, а грамадзянам Літвы, якія працуюць у санаторыі, — зарабляць і самой установе атрымліваць ад гэтага прыбытак.

Наконт санаторыя ў Юрмале няпэўнасць застаецца — ён пакуль зачынены.

КАЛЯ 750 ТЫСЯЧ БЕЛАРУСАЎ АЗДАРАЎЛЯЕЦЦА НА ЛЬГОТНЫХ УМОВАХ

Нагадаем, што права на бясплатнае і пазачарговае лячэнне і аздараўленне маюць непаўналетнія дзеці, інваліды 1-й і 2-й груп (раз у два гады), ветэраны і ўдзельнікі ВАВ і некаторыя іншыя катэгорыі. Яшчэ больш людзей мае права на льготнае санаторна-курортнае аздараўленне — за частковую аплату. Летась на такіх умовах аздараўленне прайшло каля 750 тысяч чалавек.

— У свеце няшмат краін, якія могуць дазволіць сабе санаторна-курортнае аздараўленне і лячэнне такой колькасці людзей — больш за 10 % насельніцтва, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі.

Што датычыцца дзіцячага адпачынку, то па выніках дзвюх змен у лагерах адпачыла 284 тысячы юных беларусаў. А гэта 80 % ад запланаванай колькасці. Усяго да канца лета плануецца аздаравіць 362 тысячы дзяцей.

Падчас другой змены ў Беларусі працавала каля пяці тысяч дзіцячых лагераў. Сёння гэтая лічба — каля трох тысяч, дзе штодзень адпачывае 30 тысяч дзяцей. І такая колькасць захаваецца да канца жніўня, бо стацыянарныя лагеры будуць працаваць да апошніх дзён лета.

Алена КРАВЕЦ.

Шануй сваё

ІДЭАЛЬНЫ МАРКЕТЫНГАВЫ ІНСТРУМЕНТ

Аршанскі лён і добрушскі фарфор цалкам могуць стаць геаграфічнымі брэндамі

У цяперашні час назіраецца развіццё рынкаў, калі вялікі гандлёвы абарот прыводзіць да неабходнасці эфектыўнай індывідуалізацыі паслуг і тавараў. Адным з прававых механізмаў абароны паслуг і тавараў, іх вытворцаў, захавання рэпутацыі рэгіёнаў з'яўляецца геаграфічнае ўказанне і найменне месца паходжання тавараў. Важна тое, што з дапамогай такой абароны гаспадар брэнда мае права прэтэндаваць на выкарыстанне ўласнасць, спасылаючыся на закон.

Гэта мае вялікае значэнне для развіцця рэгіёнаў, многія з якіх маюць сваю гістарычную, культурную ці прыродную ўнікальнасць, асаблівыя традыцыі, у тым ліку ў сферы прыкладной творчасці, — лічыць **начальнік упраўлення таварных знакаў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Наталля СІНІШАВА.**

Аднак чамусьці ў нашай краіне мала хто выкарыстоўвае такі прававы механізм абароны тавару, як геаграфічнае ўказанне.

Між іншым, геаграфічнае ўказанне змяшчае назву населенага пункта або мясцовасці, якое можна выкарыстоўваць на тавары для стварэння ў спажыўцоў выразнай асацыяцыі аб месцы вытворчасці прадукцыі з яе адмысловымі ўласцівасцямі, якасцю, рэпутацыяй ці іншымі характарыстыкамі. Самымі вядомымі геаграфічнымі брэндамі з'яўляюцца мураншое шкло, тульскі самавар, сыр пармезан і французскі каньяк. Калі мы чуем назвы гэтых тавараў, то як спажыўцы разумеем, пра якія рэчы ідзе гаворка, з якой краіны яны і якія іх асаблівыя ўласцівасці.

Атрымаўшы права карыстання геаграфічным указаннем, беларускі вытворца не толькі пацвярджае арыгінальнасць свайго тавару і яго якасць, але і спрыяе фарміраванню станоўчага іміджу свайго рэгіёна, горада, вёскі і краіны ў цэлым.

Нягледзячы на істотныя плюсы гэтага маркетынгавага інструмента, вялікай папулярнасці і попыту на рэгістрацыю геаграфічных найменняў у нас у краіне няма. І на гэта ёсць дзве прычыны. Па-першае, прадпрыемству для таго каб атрымаць прававую абарону геаграфічнага ўказання, неабходнае заключэнне кампетэнтнага органа, што яго тавар сапраўды надзелены геаграфічным указаннем, мае асаблівыя ўласцівасці, звязаныя з месцам паходжання. Па-другое, нашы суб'екты гаспадарання мала ведаюць аб тым, што ёсць такі аб'ект інтэлектуальнай уласнасці, як геаграфічнае ўказанне.

У цяперашні час Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці ахоўвае 37 геаграфічных указанняў. У асноўным гэта замежныя назвы: 24 грузінскія брэнды, ірландскі і шатландскі віскі, тульскі пернік і іншыя. Сярод беларускіх брэндаў — «Мінская мінеральная вада», «Лідскае піва» і «Лідскі квас». Наталля Сінішава мяркуе, што, маючы статус геаграфічнага найменя, прадукцыя суб'екта гаспадарання атрымлівае ўнікальны маркетынгавы інструмент, які дапамагае эфектыўна прасоўваць і прадаваць тавар. Другі рычаг — забарона выкарыстання падобных назваў іншымі суб'ектамі гаспадарання. У нас даволі шмат унікальных тавараў у краіне, аб якіх людзі нават не ведаюць. Вось, напрыклад, ТАА «Гермес А» здабывае сапрапелевыя лячэбныя грязі. Таксама прадпрыемства займаецца іх пастаўкай у санаторыі.

Наш беларускі лён шырока вядомы. Вырабы з лёну карыстаюцца павышанай папулярнасцю і ў ЗША, і ў Кітаі. Чаму б не зрабіць брэндам аршанскі лён? Гэта мог бы быць цудоўны інвестыцыйны праект, які б прыцягнуў сродкі ў рэгіён. Акрамя таго, добрушскі фарфор, кіраўская смажанка і нарачанская мінеральная вада валодаюць усімі ўмовамі унікальнасці геаграфічных найменняў.

Неглюбскія ручнікі можа зарэгістраваць адна майстрыха

Хто ж можа атрымаць геаграфічнае ўказанне? Гэта могуць быць проста грамадзяне, арганізацыі, юрыдычныя асобы, аб'яднанні асоб з розным суб'ектным складам.

У Беларусі ёсць майстрыхі, якія ткуць унікальныя ручнікі — неглюбскія. І з улікам нашага закона нават адна з іх, якая працягвае традыцыю, можа падаць заяўку на атрыманне геаграфічнага ўказання і атрымаць права карыстання найменнем «Неглюбскія ручнікі».

А неглюбскія ручнікі — адна з цікавінак беларускай зямлі. У адрозненне ад шырока распіяраных слуцкіх паясоў, якія на самай справе належаць да персідскай этнічнай традыцыі, ручнікі з Неглюбкі — здабытак беларускага этнасу. Са слуцкімі паясамі іх радніць тэхніка ручнога ткацтва. Ва ўсім астатнім яны антыподы. Слуцкія паясы служылі атрыбутам шляхецкага касцюма. Як вядома, шляхта лічыла сябе нашчадкамі легендарных сарматаў. Адсюль цяга да ўсяго ўсходняга.

Неглюбская традыцыя ручнога ткацтва нарадзілася на беларускай зямлі. Адной з яе асаблівасцяў з'яўляецца тое, што ручнік ткаўся са сподняга боку. Папярочныя арнаментальныя палосы майстрыхі па традыцыі называюць «храстамі».

Атрымаць геаграфічнае найменне могуць і асацыяцыі вытворцаў. У пасёлку Дрыбін майстры — шапавалы вырабляюць валёнкі. Жыхары могуць аб'яднацца ў асацыяцыю вытворцаў і падаць заяўку.

Што датычыцца самой працэдуры, то яна складаецца з некалькіх этапаў. Першае — падача заяўкі і аплата патэнтавых пошлін. Далей — экспертыза. Неабходнае заключэнне кампетэнтнага органа аб тым, што тавар мае пэўныя ўласцівасці, якасць, рэпутацыю, звязаную з месцам паходжання. І такім кампетэнтным органам з'яўляецца Акадэмія навук з усімі яе падначаленымі арганізацыямі.

У Беларусі распрацаваны шырокі спіс таго, што можа ахоўвацца такім аб'ектам інтэлектуальнай уласнасці, як геаграфічнае найменне. Гэта і расліны, і жывёліны, сельскагаспадарчая прадукцыя, вырабы рамесных промыслаў, разнастайныя напоі, мінеральныя воды, спецыі, чаі і іншыя прадукты харчавання. Не так даўно ажыццяўлялася карэкціроўка Закона «Аб геаграфічных указаннях». Сёння патрабаванні да асоб, якія збіраюцца рэгістраваць геаграфічныя назвы, максімальна спрасціліся. Галоўнае — каб тавар быў сапраўды ўнікальным.

Сяргей КУРКАЧ.

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА ЎРАДЖАЮ

«КАПЫЛЯНКА» ПРАПІСАЛАСЯ Ў ГЕРМАНІІ

У Беларусі на сённяшні дзень вырошчваецца каля 200 сартоў збожжавых і зернебабовых культур, створаных селекцыянерамі РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве».

— Па жыце сёлета нашы сарты займаюць 88 %, і толькі 12 % сартоў і гібрыдаў жыта, якое вырошчваецца цяпер у Беларусі, — нямецкай селекцыі. Па азімай пшаніцы 60 % — нашы і 40 % — польскія і нямецкія. Але ў 2015 годзе, для параўнання, гэтыя суадносіны былі 50 на 50, — распавёў **загадчык аддзела азімых збожжавых культур Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Станіслаў ГАРДЗЕЙ.**

Гродна і Брэст выкарыстоўваюць больш заходніх сартоў пшаніцы і трыцікале, Віцебская і Магілёўская вобласць традыцыйна аддаюць перавагу сартам айчыннай селекцыі, адзначыў навуковец. Ён падкрэсліў, што падобная карціна — па азімым ячмені: сёння прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу Беларусі, як правіла, аддаюць перавагу беларускім сартам.

— Таксама ў апошнія гады назіраецца моцная зацікаўленасць у нашых новых сартах у расійскіх калег. І гэта не толькі суседнія Бранск і Смаленск. Распрацоўкі селекцыянераў НПЦ па земляробстве карыстаюцца попытам аж да Урала.

Селекцыйную работу навукоўцы НПЦ НАН Беларусі па земляробстве вядуць па 42 культурах. Асноўныя — збожжавыя, зернебабовыя, крупяныя і алейныя культуры. Карыстаецца попытам насенне сартоў азімай і яравой пшаніцы, ячменю, жыта і рапсу.

— У цэлым па краіне пашырыліся плошчы азімага ячменю, — расказаў спецыяліст. — Сёлета — каля 60 тысяч га, а некалькі гадоў таму было 10-12 тысяч га.

Азімы ячмень — досыць капрызная культура, калі казаць пра яе зімаўстойлівасць. Найбольш прыдатныя зоны для яго вырошчвання — заходнія і паўднёва-заходнія раёны, а ўжо Ашмянскі і Смаргонскі раёны — зона рызыкоўнага вырошчвання азімага ячменю. Але сёння клімат змяняецца ў бок пацяплення, і калі дадзеная тэндэнцыя захаваецца, культура выдатна будзе адчуваць сябе і там. Азімы ячмень вытрымлівае толькі 12-13 градусаў марозу, расказаў Станіслаў Гардзей. Але, магчыма, селекцыянерам удасца зрушыць гэты біялагічны бар'ер.

— За гады існавання нашага інстытута створана больш за 460 сартоў і гібрыдаў сельскагаспадарчых культур, — паведаміў ён. — Каля 80 сартоў уключана ў рэестры шэрагу краін далёкага і блізкага замежжа. У Германіі, у прыватнасці, раяніраваны нашы сарты лубіну. А створаны ў нас сорт азімай пшаніцы «капылянка» з'яўляецца ў Германіі на сённяшні дзень эталонам па хлебапякарнай якасці збожжа.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

БУЛЬБУ САРТУЕ ПРАГРАМА

— Першачарговая задача навукоўцаў нашага цэнтра — максімальная механізацыя і аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Мікалай БАКАЧ.** — Рашэнне такой задачы немагчымае без прымянення сістэм кропкавага земляробства, якія даюць шанц павысіць канкурэнтаздольнасць сельскай гаспадаркі і магчымасць пераадолець структурныя недахопы цяперашняй сельскагаспадарчай сістэмы.

Ён адзначыў важнасць «адраснай» работы, так бы мовіць, «індывідуальнага падыходу» пры стварэнні машын і абсталявання для сельскагаспадарчай галіны. Бо тое, што задавальняе фермерскія гаспадаркі, не падыдзе для буйных аграпрамысловых прадпрыемстваў, а тое, што ідэальна працуе ў адных кліматычных умовах, будзе бескарыснае ў іншых. У апошнія гады ў краіне рэалізаваны цэлы шэраг праграм па развіцці сельскагаспадарчага машынабудавання, што дазволіла асвоіць вытворчасць каля тысячы марак і мадэляў сельгастэхнікі. Вучоны заявіў, што сёння амаль 90 % сельгаспрадукцыі, а па асобных пазіцыях — і ўсе сто, — вырабляецца з дапамогай тэхнікі айчыннай вытворчасці.

Адна з напрацовак навукоўцаў — анлайн-дадатак, дзе сфарміраваны асобныя модулі для прагназавання метэаўмоў, фарміравання аптымальных транспартных маршрутаў, уліку выдаткаў матэрыяльных рэсурсаў. Дадатак знаходзіцца ў адкрытым доступе. У ліку іншых распрацовак — праграмнае забеспячэнне для аптычнай сістэмы распазнавання некандыцыйных клубняў бульбы, створанае сумесна з калегамі з Інстытута праблем інфарматыкі. Пакуль праграма ўмее распазнаваць толькі знешнія дэфекты клубняў. Але ж якасць бульбіны часам немагчыма ацаніць, пакуль яна не пачышчана і не разрэзана — гэта вядома кожнай гаспадыні. Магчымасць распазнаваць і «ўнутраныя» дэфекты клубня — наступны этап удасканалення праграмнага забеспячэння. Яшчэ адна сумесная распрацоўка з праграмістамі — стварэнне лініі па сартаванні яблыкаў па якасці, колеры і памеры.

«Завершаны два этапы сумеснай беларуска-расійскай праграмы, накіраванай на даследаванне ўнікальнага бялку лактаферыну. Рэчыва вылучаюць з фармацыі казінага малака. Прэпараты з яго ўмацоўваюць імунітэт, зніжаюць рызыку інсультаў і інфарктаў і нават дапамагаюць супрацьстаяць коўіду».

ДОЙКУ ДАВЕРЫМ РОБАТАМ

Адным з асноўных дасягненняў у галіне ўдасканалення генетычнага патэнцыялу прадукцыйнасці сельскагаспадарчых жывёл **першы намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Уладзімір ЦІМАШЭНКА** назваў беларускую малочную галштынскую пароду кароў.

— Сёння яе колькасць больш за мільён, і 80 % малака, якое вырабляецца ў краіне, — ад жывёлін гэтай пароды, — падкрэсліў Уладзімір Мікалаевіч. — Яна адрозніваецца ад традыцыйнай для Беларусі чорна-пярэстай пароды ў першую чаргу тым, што гэта спецыялізаваная малочная парода з высокай канверсіяй корму. Патэнцыял прадукцыйнасці жывёлін гэтай пароды ацэньваецца ў 10-12 тысяч кілаграм малака за лактацыю, а мяжа прадукцыйнасці чорна-пярэстай — 8-9 тысяч кілаграм. А галоўнае, яна прыстасаваная да тых прамысловых тэхналогій, па якіх вырабляецца асноўная частка малака ў нашай краіне.

Сёння селекцыянеры працуюць над стварэннем чырвонай спецыялізаванай малочнай пароды кароў. Работы вядуцца на прадпрыемстве «ЖодзінаАграПлемЭліта», у гаспадарках Акадэміі навук. Базавай з'яўляецца гаспадарка «Новы двор» Свіслацкага раёна, дзе захавалася і развіваецца беларуская чырвоная парода: дзякуючы намаганням навукоўцаў захаваны яе генафонд і паступова нарошчваецца пагалоўе.

— Ад колькасці менш за сто галоў набліжаемся ўжо да чатырохсот, — расказаў спецыяліст.

Як і ў малочнай жывёлагадоўлі, у свінагадоўлі патэнцыял прадукцыйнасці таксама назапашваецца за кошт выкарыстання ў селекцыі генетычных маркёраў і фарміравання бацькоўскіх формаў, якія змяшчаюць гэтыя маркёры, адзначыў навуковец.

Яшчэ адзін кірунак работы ў сферы жывёлагадоўлі — апрабацыя і ўключэнне ў схемы кармлення новых пажыўных рэчываў і элементаў.

— Гаворка пра адходы вытворчасці прадукцыі мясцовых прадпрыемстваў, мінеральнай сыравіны, — растлумачыў спецыяліст. — Гэта істотна ўплывае на сабекошт рацыёнаў — а значыць, на сабекошт прадукцыі і яе канкурэнтаздольнасць.

Адзін з прыярытэтных напрамкаў работы — зніжэнне выдаткаў ручной працы ў жывёлагадоўлі за кошт комплекснай механізацыі ўсіх працэсаў.

— Палова фермаў, якія вырабляюць малако ў нашай краіне, — гэта сучасныя комплексы, наноў пабудаваныя або рэканструяваныя. Практычна ўсе свінагадоўчыя комплексы забяспечаны сучасным абсталяваннем, якое дазваляе ў большасці выпадкаў механізаваць і аўтаматызаваць працэсы кіравання мікракліматам, кармлення. Аператар ад рацыённых работ пераходзіць да функцыі кантролю гэтых працэсаў. Далейшае развіццё — паслядоўная рабатызацыя аўтаматычных працэсаў, у першую чаргу такіх працаёмкіх, як даенне. Ужо сёння частка фермаў абсталявана робатамі.

Завершаны два этапы сумеснай беларуска-расійскай праграмы, накіраванай на даследаванне ўнікальнага бялку лактаферыну. Рэчыва вылучаюць з фармацыі казінага малака. Прэпараты з яго ўмацоўваюць імунітэт, зніжаюць рызыку інсультаў і інфарктаў і нават дапамагаюць супрацьстаяць коўіду.

— Мы стварылі статак і атрымалі малако, якое змяшчае лактаферын, — расказаў Уладзімір Цімашэнка.

На наступным этапе работы галоўная роля ў медыкаў — яны правядуць усе неабходныя праверкі і даследаванні для далейшага выкарыстання прадукту ў медыцынскіх мэтах.

ДРОНЫ ДАПАМОГУЦЬ АГРАРЫЯМ

— У рамках супрацоўніцтва з беларуска-кітайскім ЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» распрацоўваюцца тэхналогіі прымянення беспілотных лятальных апаратаў, дронаў у сельскай гаспадарцы, — адзначыла **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута аховы раслін НАН Беларусі Алена ЯКІМОВІЧ.** — Унясенне дронам сродкаў аховы раслін даволі перспектыўнае на культурах з высокімі сцёбламі (рапс і кукуруза), а таксама для барацьбы з інвазійнымі відамі раслін. Мэтазгодная і перспектыва ўнясення дронамі дэсікантаў.

Акрамя таго, сёння сумесна з лабараторыяй аэракасмічнага маніторынгу Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі распрацоўваецца доследны ўзор праграмнага забеспячэння прагнознага маніторынгу хвароб бульбы для павышэння эфектыўнасці ахоўных мерапрыемстваў, адзначыла Алена Анатолеўна. Яшчэ адзін напрамак работы навукоўцаў — распрацоўка і ўкараненне ў вытворчасць угнаенняў на аснове арганічнай часткі цвёрдых камунальных адходаў і цэлюлозазмяшчальных матэрыялаў.

«Па жыце сёлета нашы сарты займаюць 88 %, і толькі 12 % сартоў і гібрыдаў жыта, якое вырошчваецца цяпер у Беларусі, — нямецкай селекцыі. Па азімай пшаніцы 60 % — нашы і 40 % — польскія і нямецкія. Але ў 2015 годзе, для параўнання, гэтыя суадносіны былі 50 на 50».

— Работа вядзецца сумесна з Інстытутам жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі, — адзначыла спецыяліст. — Выкарыстоўваецца лістота драўнінна-хмызняковых раслін, цвёрдыя камунальныя адходы, дадаюцца распрацаваныя намі мікрабіялагічныя прэпараты з мэтай узмацнення перапрацоўкі і ператварэння адходаў у сыравіну, якая можа спажывацца раслінамі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

УНП 200177723

Открытое акционерное общество «БАРАНОВИЧСКАЯ ПТИЦЕФАБРИКА» извещает о проведении повторного аукциона по продаже недвижимого имущества.
Аукцион состоится 11 августа 2022 года в 10.00 по адресу: Брестская область, Барановичский район, п/о Русино здание клуба ОАО «Барановичская птицефабрика»

Предмет торгов – Лот	1. Капитальное строение (детский сад–начальная школа) с инвентарным номером 110/С-95169, общей площадью 316,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131 на земельном участке с кадастровым номером 120489402101000099, площадью 0,5526 га; 2. Капитальное строение (водопроводные сети) с инвентарным номером 110/С-103203, протяженностью 63,6 м, расположенные по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131; 3. Капитальное строение (канализационные сети) с инвентарным номером 110/С-103195, общей площадью 47,8 м, расположенные по адресу: Брестская область, Барановичский район, Тешевлянский с/с, д. Люшнево, ул. Встречная, д. 131, протяженностью 47,8 м
Начальная цена без учета НДС, руб.	2 595,18
Размер задатка, руб.	259,52

Продавец и организатор аукциона: ОАО «Барановичская птицефабрика», 225350, п/о Русино, Барановичский район, Брестская область.
Задаток перечисляется с даты публикации данного извещения по 10 августа 2022 года на расчетный счет Продавца BY73BAPB30124401000110000000 ОАО «Белагропромбанк» ул. Советская, 150, БИК BAPBBY2X, ОКПО 00745326, УНП 200177723. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты: единовременный платеж в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения
Договор купли-продажи объекта аукциона заключается не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Дополнительная информация по телефонам: 8 0163 644 694 (юр. сектор), 644 768 (приемная).
Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией по адресу: 225350, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика»
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225350, Брестская область, Барановичский район, п/о Русино, ОАО «Барановичская птицефабрика» с пометкой «На аукцион» с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 по рабочим дням по 10 августа 2022 года включительно.
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, размещен на официальном сайте Продавца **www.zlatko.by** и в извещении о ранее проведенном аукционе, опубликованном в газете «Республика» 18 декабря 2021 г.

ДА АПОШНЯГА ЗЯРНЯТКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Некалькі гадоў таму супрацоўнікі патрульнай службы затрымалі легкавы аўтамабіль, у багажніку якога аказалася пяць мяхоў збожжа, — успамінае **кіраўнік групы старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Магілёўскага аблвыканкама маёр міліцыі Аляксандр ФІРСІН.**— Даведаліся ў кіроўцы, дзе ўзяў збожжа, і паехалі на пазначаны адрас. У выніку раскрылі групу грамадзян, якая займалася крадзяжом зерня і яго рэалізацыяй. Самае неверагоднае, што пра яе існаванне ведаў вартаўнік, які пры гэтым нікуды не паведамляў. Маўляў, не мая справа.

Успомнілі таксама гісторыю аб «прадпрымальным» механізатары, які ўмудрыўся за невялікі тэрмін украсці каля тоны паліва. Абсталяваў у сваім гаражы сховішча і гандляваў народным дабром. Вядома, што ў гаспадарках працуе добрасумленных грамадзян больш, чым зламыснікаў. Але трэба трымаць руку на пульсе.

— Напярэдадні масавай уборачнай кампаніі важна праверыць гатоўнасць тэхнікі, месцы захавання будучага ўраджаю, каб потым не адцягваць механізатараў і кіраўніцтва ад іх непасрэдных абавязкаў, — аргументуе Аляксандр Фірсін. — Асноўная задача — акцэнтаваць увагу на праблемныя моманты, каб іх ліквідавалі. Мы будзем і далей суправаджаць уборачную кампанію, але нашы задачы зменяцца па ходу яе рэалізацыі. Калі пойдзе новы ўраджай, будзем глядзець, каб не было яго страт па дарозе і на самім жніве.

Такія рэйды ў вобласці цяпер праводзяцца рэгулярна. На гэты раз у маіх спадарожнікаў задача праверыць дзейнасць гаспадарак Крычаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў.

— На тыдзень выязджаем па два-тры разы ў складзе груп УУС, — удакладняе **дзяржаўны аўтамабільны інспектар міжраённага аддзела ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вадзім ЛЕАНЕНКА.** — На месцах правяраем наяўнасць тэхнікі, яе стан, умовы для медыцынскага агляду

на стан ап'янення, прыборны кантроль і гэтак далей.

Суразмоўнік адзначае, што асноўныя парушэнні датычацца асвятляльных прыбораў. Апошнія часта застаюцца без належнай увагі, дзесьці на гэта закрываюць вочы. А потым здараюцца аварыі. Тэхніка з палеткаў вяртаецца звычайна ў прыцемках, калі на дарогах, асабліва прасёлачных, нічога не відаць. Дзесьці тэхніка выходзіць на лінію без тэхагляду, што таксама з'яўляецца грубым парушэннем.

У абавязкі супрацоўніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі старшага інспектара Яўгена Бука ўваходзіць кантроль за надзейнасцю захавання таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на аб'ектах АПК, прафілактыка крадзяжоў, праверка арганізацыі вартавой аховы. Такі жорсткі кантроль, па сутнасці, ажыццяўляецца падчас уборачных заўсёды, але сёлета ён набывае асаблівы сэнс.

— У святле тых падзей, якія адбываюцца ў свеце, людзі сталі больш адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, цаніць тое, што ёсць, — кажа Аляксандр Фірсін. — Нам можна ганарыцца, што ў нас ёсць парадак, палі, ураджай.

Праверкі на месцах

Работу пачынаем з Крычаўскага РАУС. Менавіта тут вырашаецца пытанне, у якую гаспадарку мы паедзем. Пасля невялічкай размовы з начальнікам РАУС мае спадарожнікі разыходзяцца па аддзелах, напрамкі работы якіх яны курыруюць, каб праглядзець так званыя справаназапашвальнікі. Там адлюстроўваецца работа супрацоўнікаў міліцыі па канкрэтным родзе дзейнасці. У Крычаўскім раёне пяць сельгаспрадпрыемстваў. Задача правяраючых вывучыць існуючыя недахопы па кожным з іх.

— Не павінна быць канстатацыі адной праблемы, павінны быць шляхі вырашэння, — расказвае, якія існуюць патрабаванні, Аляксандр Фірсін. — Умоўна кажучы, трэба, напрыклад, прапісаць: адрамантаваць камбайн або залатаць дзіркі ў агароджы і гэтак далей. Перапраўляем і робім пэўныя вывады, ці разумеюць на месцах заклапочанасць. Калі ацэньваць сітуацыю ў цэлым па вобласці, праблемы ёсць, але яны вырашальныя. Ёсць перадавыя прадпрыемствы і, на жаль, ёсць і адстаючыя. Але работа наладжана так, што больш моцная гаспадарка дапамагае больш слабай. Усе разумеюць, якія задачы перад імі стаяць, і працуюць на вынік.

Начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Крычаўскага РАУС Міхаіл РУСАКОВІЧ дзеліцца набалелым: «На жаль, усё яшчэ здараюцца выпадкі, калі людзі крадуць або злоўжываюць спіртнымі напоямі. Сёлета мы ўстанавілі асоб, які нават спакусіліся на насенны фонд краіны. Такія факты недапушчальныя. Наша задача — іх абагульняць і перадаваць вышэйстаячаму кіраўніцтву».

Пакуль рэйдавая група з Магілёва вывучае абстаноўку па дакументах, разам з **начальнікам Крычаўскага РАУС Андрэем ЛАЗАКОВІЧАМ** едзем паглядзець, як яна складваецца на палях.

— Харчовая бяспека краіны ў цэлым і нашага раёна ў прыватнасці — вельмі важная работа, — кажа ён. — Ход уборачнай і пасяўной кампаній абмяркоўваем і на пасяджэннях райвыканкама, і непасрэдна ў гаспадарках. Нашы рэйдавыя групы ўдзельнічалі ў маніторынгах сельскагаспадарчай тэхнікі і выяўлялі шэраг недахопаў. Але яны ў акрэсленыя тэрміны ліквідаваліся. Асабіста выязджаю на мехдвары, дзе размаўляю і з кіраўнікамі, і з механізатарамі. Усе разумеюць адказнасць, бачаць, што адбываецца ў свеце. Вунь па нашы прадукты едуць жыхары еўрапейскіх краін. І гэта дакладны сігнал, што нам нельга расслабляцца, трэба прыкласці максімум высілкаў для забеспячэння ўраджаю. На ўборку кінуты ўсе сілы раёна. Прадпрыемствы, дзе ёсць тэхніка, работнікі, якія могуць працаваць на камбайнах і маюць допуск, задзейнічаныя рашэннем райвыканкама ва ўборачнай кампаніі.

Дарэчы, у полі СВК «Калгас імя Суворава» якраз знаёмімся з экіпажам, у складзе якога працуе ў тым ліку супрацоўнік аддзела адукацыі Крычаўскага раёна. Ён дапамагае інжынеру па эксплуатацыі ўбіраць рапс. Менавіта з дзейнасцю СВК больш канкрэтна вырашылі азнаёміцца і правяраючыя з Магілёва. Гаспадарка знаходзіцца якраз на мяжы з Чэрыкаўскім раёнам. І хоць прыйшлося ехаць да яе па дастаткова складаных дарогах, арганізацыя работы тут парадавала.

Старшыня СВК «Калгас імя Суворава» Міхаіл МАЛАШЭНКА быў у гуморы. Раніцай ён паспеў з'ездзіць у Клімавічы і на выгадных умовах дамовіцца з КХП наконт перапрацоўкі рапсу.

— Гаспадарка працуе стабільна, павялічваем выручку, — паведаміў ён. — У калгасе імя Суворава не запрацуе толькі лайдак, які нічога не можа рабіць. Сярэдняя зарплата за шэсць месяцаў склала ў нас 900 рублёў, а за чэрвень — усе 1200. За чэрвень некаторыя механізатары зарабілі больш чым па тры тысячы рублёў.

У калгасе працуюць 87 чалавек. Міхаіл Аляксеевіч не хавае, што клапоціцца пра кожнага работніка і нават дзецям дае магчымасць зарабіць. У выніку і кадры ў яго атрымліваюцца зайздросныя. Той жа **галоўны аграном Юрый БЕРАЗУЕЎ**, як ён кажа, лічы, выраснуў гаспадарцы.

З відэакамерамі на мехдвор

Але самае ўражальнае, што гаспадарка сёлета нават відэакамеры ўстанавіла на мехдвары. І збіраецца ў найбліжэйшым будучым абсталяваць імі зерняток. Акрамя таго, каб спыніць крадзеж паліва, на тры машыны ўстаноўлены сістэмы GPS, па якіх адсочваецца, дзе знаходзіцца тэхніка і якую яна выконвае работу. Плануецца ўстанавіць такія сістэмы яшчэ на трох машынах.

Юрый Беразуеў правёў экскурсію па мехдвары і адказаў на ўсе пытанні праваахоўнікаў. Тыя засталіся цалкам задаволеныя. Інспектар ДАІ Вадзім Леаненка адзначыў, што па выніках праверкі гаспадарка экзамен вытрымала і асабіста ў яго асаблівых прэтэнзій да яе няма. «Калі б усе гаспадаркі былі такія, як гэта, было б нядрэнна, — ахарактарызаваў абстаноўку старшы оперупаўнаважаны Аляксандр Фірсін. — Працэнт тэхнікі, якая рамантуецца, невялікі. Асноўная ж, і мы гэта бачылі, працуе на полі. Кіраўнік гаспадаркі вопытны, галоўны аграном — таксама. Яны не лунаюць у аблоках, клапоцяцца пра людзей і маюць добры вынік.

Не было асаблівых заўваг да гаспадаркі і ў **старшага інспектара ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Яўгена БУКА.** «Камеры відэаназірання, якімі абсталявана тэрыторыя мехдвара, з'яўляюцца адным з перадавых метадаў забеспячэння як захаванасці маёмасці, так і бяспекі. Заслугоўвае адабрэння і тое, што памяшканні, дзе захоўваецца тэхніка і ГЗМ, абсталяваны надзейнымі запорнымі ўстройствамі. 8-9 балаў па дзесяцібальнай сістэме гэтай гаспадарцы можна смела ставіць.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

Крычаўскі раён.

❍ У тэму

Аляксандр ГЕРМАНОВІЧ, выконваючы абавязкі начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама:

— Прагназаваны сусветны крызіс у разы павялічвае значнасць харчовай бяспекі. Прэзідэнт нашай краіны паставіў дакладныя і канкрэтныя задачы перад аграрыямі па ўборачнай кампаніі. Дакладна пазначана і роля праваахоўных органаў у забеспячэнні захаванасці сабранага ўраджаю. Рэалізоўваючы свае паўнамоцтвы, міліцыя Магілёўшчыны правяла абследаванне ўсёй без выключэння сельгастэхнікі і месцаў будучага захоўвання збожжа. Штодня рэйдавыя групы праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы па спыненні фактаў крадзяжу ўбраных культур, а таксама ГЗМ. Безумоўна, большасць працаўнікоў сельскай гаспадаркі — добрасумленныя і законапаслухмяныя людзі, але ёсць і тыя, чые незаконныя намеры прадухіляюцца менавіта дзякуючы актыўнай прафілактычнай рабоце. Мэта і задача міліцыі — не перашкаджаючы працэсу ўборкі, гарантаваць бяспеку і парадак на прадпрыемствах АПК і зрабіць усё неабходнае для захавання ўраджаю.

❍ Тым часам

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ 29 ліпеня наведаў Іўеўскі раён, паведамляе карэспандэнт БелТА.

Аляксандр Вальфовіч, які з'яўляецца ўпаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў Гродзенскай вобласці, сустрэўся з мясцовым актывам, абмеркаваў грамадска-палітычную і сацыяльна-эканамічную абстаноўку ў рэгіёне, азнаёміўся з ходам уборкі збожжавых культур, наведаў шэраг сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Дзяржсакратар асабліва звярнуў увагу кіраўнікоў раёна і сельгасарганізацый на аператыўнае і якаснае вырашэнне праблем, узнятых 26 ліпеня Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам на рэспубліканскай селектарнай нарадзе па пытаннях уборачнай кампаніі.

Аляксандр Вальфовіч падкрэсліў, што пры сусветнай негатыўнай тэндэнцыі цэн на прадукты харчавання, выкліканай ваеннымі канфліктамі, палітычна матываванымі санкцыямі і кліматычнымі катаклізмамі, для Беларусі захаванне патэнцыялу аграпрамысловага комплексу, паспяховае правядзенне жніва застаюцца найбольш важнымі складнікамі эканамічнай і харчовай бяспекі.

Дзяржсакратар адзначыў неабходнасць пастаяннага ўмацавання працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны пры правядзенні ўборачнай, недапушчальнасці страт збожжа, выкліканых парушэннем правіл яго транспарціроўкі і захоўвання, жорсткага рэагавання на выяўленыя факты безгаспадарчасці, прыпісак і крадзяжоў у разгар гарачай пары, усямернай падтрымкі органамі мясцовай улады аграрыяў у вырашэнні ўзнікаючых праблем.

Ну і ну!

КУР'ЕР ТЭЛЕФОННЫХ АШУКАНЦАЎ ЗАБРАЎ У ГАМЯЛЬЧАН БОЛЬШ ЗА Br71 ТЫСЯЧУ

У Гомелі затрыманы 14-гадовы кур'ер тэлефонных ашуканцаў. Ён падазраецца ў тым, што забраў у мясцовых жыхароў больш за 71 тысячу рублёў. Аб гэтым паведаміла Міністэрства ўнутраных спраў.

Паводле інфармацыі ведамства, 14-гадовага кур'ера тэлефонных аферыстаў затрымалі на месцы злачынства. Школьнік зайшоў у банк, каб перавесці ўкрадзеныя грошы куратарам. Сышчыкі высветлілі, што за гадзіну да гэтага ён забраў буйную суму ў пенсіянера. Падлетак падазраецца ў некалькіх эпізодах падману пенсіянераў. Пацярпелым прапаноўвалася аказаць дапамогу сваякам, якія нібыта пацярпелі ў ДТЗ ці сталі іх віноўнікамі. За апошні тыдзень хлопец пабываў у пяці гомельскіх кватэрах. Ён прыязджаў да ахвяр, забіраў у іх грашовыя сродкі і пераводзіў на карт-рахункі сваіх куратараў. Агульная сума ўкрадзенага склала больш за Br71 тысячу.

Аб'яву аб нелегальным заробку фігурант знайшоў у Telegram-чаце. Яго пераканалі, што заданні не звязаныя з наркотыкамі, і паабяцалі добрую аплату ў канцы рабочага дня. Аб рызыцы панесці крымінальную адказнасць школьніка не папярэдзілі. Цяпер па ўсіх фактах махлярства распачаты крымінальныя справы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 31 августа 2022 в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов

№ п/п	Наименование объектов продажи в лоте	Описание	Начальная цена продажи без учета НДС 20 %, белорусских рублей	Задаток, белорусских рублей
Лот № 1	**Печатная машина с ротационными цилиндрическими шаблонами «ТОТЕКС»**	Дата ввода в эксплуатацию – 01.11.1980. Печатная машина в нерабочем состоянии: отсутствуют красочные насосы; требуется замена: декельного полотна (кирзы); ведомого барабана; щеток мойки кирзы; укомплектования роликами. Основные характеристики: оборудования: ширина 7 м; длина 19 м; высота -6 м; скорость печати от 8 до 80 м/мин. Производитель: Чехия	85 000,00 (восемьдесят пять тысяч рублей 00 копеек)	8 500,00 (восемь тысяч пятьсот рублей 00 копеек)

Собственник имущества: ОАО «Могилевтекс», 212011, г. Могилев, ул. Гришина, 87, УНП 700116054, тел. для осмотра объектов продажи (0222)73-86-31.

Организатор торгов: Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 31 августа 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – **30 августа 2022 до 12.00.**

Регистрация участников торгов **31 августа 2022 с 13.30 до 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефон для справок: (0222) 778042, + 375296927492 (А1).

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельремстрой» (продавец) извещает о проведении 10 августа 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 40 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Местонахождение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8		
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-53859** общей площадью **1 073,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Ограничение (обременение): ипотека (договор № 0-300-3-933-96/1 от 03.02.2020 г.). Капитальное строение с инв. № 350/С-53861** общей площадью **132,8 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **столярный цех. Капитальное строение с инв. № 350/С-53862** общей площадью **196,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Капитальное строение с инв. № 350/С-221976** общей площадью **523,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **2-этажное здание склада. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002001741** общей площадью **0,9440 га – для содержания и обслуживания производственной базы (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8. **Ограничение (обременение):** договор аренды № 26 от 31.12.2020 г., сроком действия по 31.12.2023 г., площадь, сданная в аренду – **36,8 кв. м;** договор аренды № 28 от 31.12.2020 г., сроком действия по 31.12.2023 г., площадь, сданная в аренду – **305,3 кв. м**	**1 641 000,00**	41 025,00

Продавец: ОАО «Гомельремстрой», г. Гомель, ул. Шилова, 6.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (044) 522-00-14 – Колесников Сергей Григорьевич (осмотр имущества); 8 (044) 745-58-84- Халилова Мая Григорьевна (заключение договора купли-продажи).

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельремстрой»):** р/с BY04 BLBB 2120 0490 0839 2400 1005 в ОАО «Белинвестбанк» г. Гомель, БИК BLBBBY2X, УНП 490083924, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 июля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 8 августа 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** 50 % цены продажи объекта в течение 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи; 50 % цены продажи объекта в следующем порядке: 25 % в течение 90 дней с момента заключения договора купли-продажи; 25 % в течение 180 дней с момента заключения договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.05.2022 г. № 101(29723).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029)126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЮРИДИЧЕСКОГО ЛИЦА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ПРОЦЕССЕ ЛИКВИДАЦИИ

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00080** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

Продавец: открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская, 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов 31.08.2022 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 240/С-32660 площадью 383,4 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36, наименование – здание административно-бытового корпуса, назначение – здание административно-хозяйственное. Кап. строение с инв. № 240/С-32678 площадью 404,6 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/1, наименование – гараж, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: смотровая яма. Кап. строение с инв. № 240/С-32677 площадью 64,5 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/2, наименование – здание центрального теплового пункта, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Кап. строение с инв. № 240/С-32673 площадью 11,7 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/3, наименование – здание контрольно-пропускного пункта, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: ограждение (забор железобетонный, забор металлический на бетонных столбах, забор кирпичный, калитка, ворота № 1, ворота № 2, ворота № 3, ворота № 4). Кап. строение с инв. № 240/С-32680 протяженностью 344,7м. по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная теплосеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 240/С-32681 протяженностью 308,9 м. по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внутриплощадочная теплосеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 240/С-32682 протяженностью 92,7 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная сеть хозпитьевого водопровода, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32684 протяженностью 309,9 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – Внутриплощадочная сеть хозпитьевого водопровода, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32686 протяженностью 287,8 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная сеть напорной бытовой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32687 протяженностью 211,5 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внутриплощадочная сеть бытовой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-129751 площадью 816,3 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, раскройно-заготовительный цех, наименование – раскройно-заготовительный цех, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Кап. строение с инв. № 240/С-129752 площадью 24530,4 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 240/С-129753 протяженностью 648,6 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети дождевой канализации, наименование – сети дождевой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: песковые площадки, канализационная насосная станция, очистные сооружения дождевых вод. Кап. строение с инв. № 240/С-129754 протяженностью 1048,0 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети противопожарные, наименование – сети противопожарные, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности: сети водопровода, пожарный водоем № 2, пожарный водоем № 1. Кап. строение с инв. № 240/С-129755 протяженностью 629,0 м. по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети связи, наименование – Сети связи, назначение – сооружение специализированное связи. Кап. строение с инв. № 240/С-129756 площадью 2,5 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, каналицационно-насосная станция бытовых стоков, наименование – канализационно-насосная станция бытовых стоков, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Сети электроснабжения, 2008 г. п., протяженность линейного сооружения 2868,4 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети элекроснабжения, инв. № 263, составные элементы: электроснабжение 0,4кВ, электроосвещение наружное, электроснабжение 10кВ. Кап. строение с инв. № 240/С-129757 площадью 1724,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, склад несортированного круглого леса, наименование – склад несортированного круглого леса, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Кап. строение с инв. № 240/С-129758 площадью 1861,6 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, склад сортированного круглого леса, наименование – склад сортированного круглого леса, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Недвижимое имущество находится на зем. участке с кадастровым № 223656200001000209 площадью 4,0806 га по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 (право постоянного пользования) и зем. участке с кадастровым № 223656200001000210 площадью 0,2906 га по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск (право постоянного пользования).

Кран мостовой подвесной электрический (два двутавра, кран балка, электроталь), инв. № 510, котел КВГТ-100 (ТЭМ 100), инв. № 770, теплосчетчик ТЭМ 104-2, инв. № 257, станок заточной по металлу, инв. № 521, станок торцовочный ЦМЭ, инв. № 4, станок для вальцевания ленточных пил Mebor VP210, инв. № 765, станок заточной для ленточных пил Mebor Ba530, инв. № 764, станок плоскошлифовальный Reform AR13/51, инв. № 304, станок для обработки боковой поверхности зуба vollmer.tupe chhf 21H, инв. № 304, станок Vollmer LG21H для перепоя зуба бурой, инв. № 304, зубозаточной станок с ЧПУ vollmer CHC Eco, инв. № 304, навес, инв. № 913, фундаментные блоки (склад цепы), инв. № 320, блок питания БиРП 24-3, инв. № 268, модуль сопряжения, инв. № 270, прибор Аларм, инв. № 269, пункт ПР № 02-14УЗ, инв. № 508, вводное устройство ВРУ, инв. № 297, шкаф ПР85-1н1-3-101-4, инв. № 279, шкаф ПР85-1н1-3-101-4, инв. № 280, шкаф ПР85-1н1-3-101-4, инв. № 294, шкаф распределительный ПР 85 ИН 1-3, инв. № 278, шкаф распределительный ПР 85 ИН 1-7, инв. № 277, шкаф распределительный Щ81-ИНБ-1А-100, инв. № 276, шкаф Щ81-ИНБ-4, инв. № 275, шкаф Щ81-ИНБ-5, инв. № 274, щиток вводно-распределительный, инв. № 507, щиток вводно-распределительный, инв. № 509, электродвигатель Аир 160м 18,5/1500 об, инв. № 255, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220.011, инв. № 154, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220.011 инв. № 155, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220 011, инв. № 156, ячейка № 1, инв. № 494, ячейка № 2, инв. № 493, агрегат ФЛИГТ, инв. № 252, агрегат ФЛИГТ, инв. № 253, панель управления ФЛИГТ в комплекте, инв. № 249, датчик реле разности давления, инв. № 512, насос СМ 125-80-315А-4, инв. № 256, устройство ж/д переездов, инв. № 204, малые архитектурные формы (2 комплекта), инв. № 213, комплект офисной мебели, инв. № 7028. Схема движения (ПВХ 6мм) 1 шт., беседка 1 шт., вывеска на козырёк 4840х780 мм 1 шт., ленточная пила 140Х1, 2Х7,350 шаг 45 мм – 4 шт., механическое ленточнобивочное устройство МУЛ -17-1 шт., пила дисковая тв./сп.D350 d110 2 шт., лента латунная 1,8 кг, огнетушитель ОП-4 – 3 шт., огнетушитель ОП-4 – 1 шт., ведро пожарное – 2 шт., топор 1 шт., полипропилен гранулированный – 1,4 тонн, телевизор «Витязь» 1 шт., флаг РБ 1 шт., шкаф НФ металлический для бытовых помещений – 11 шт., электро радиатор масленный 1 шт., контейнер для ТБО 1 шт., громкоговоритель рупорный – 3 шт., фонарь 6 шт., светильник – 14 шт., прожектор осветительный – 30 шт., лампа уличного освещения – 29 шт.

Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36.

Нач. цена: 1 354 435,31 бел. руб. без учета НДС.

Задаток: 135 443,53 бел. руб.

Лот № 2. Лесопогрузчик АМКОДОР 352Л с навесным оборудованием 2007 г. в., идентификационный номер ЗА352Л0070028, инв. № 487 (отсутствуют регистрационные документы) по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36. **Нач. цена: 24 360,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2436,00 бел. руб.**

Лот № 3. Кап. строение с инв. № 240/С-34172 площадью 530,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/6, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения. Кап. строение с инв. № 240/С-129543 площадью 1518 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/7, наименование – Мастерская, назначение – здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 240/С-129750 площадью 18,8 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/8, наименование – Здание проходной, назначение – здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 240/С-129652 площадью 36,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/9, наименование – Здание котельной, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: дымовая труба. Наружная теплотрасса по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18, наружная теплотрасса, протяженность линейного сооружения – 31,0 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, инв. № 908. Навес для дров (разборный) инв. № 101111, устройство для мойки техники инв. № 10073, мобильное здание (передвижной вагон-бытовка), инв. № 1033, кран-балка, инв. № 6404, кран-балка, инв. № 4442, кран-балка, инв. № 4604, электроталь, инв. № 4511, электроталь, инв. № 909, отопитель для мастерской, инв. № 4193, котел топливный КСТ-60, инв. № 4365, котел КСТ-80, инв. № 4364, насос К 20/18 (2,2/3000), инв. № 6460, насос К 20/18 (2,2/3000), инв. № 6451, насос К 20/18 (2,2/3000), инв. № 6450, насос ФГП 50/12,5А, инв. № 6465, станок фрезерный 6Н81, инв. № 64692, станок фрезерный ФТ-98 WANDERER, инв. № 4526, пресс кузнечный, инв. № 4620, ограждение металлическое, инв. № 10117, ограждение кирпичное, инв. № 10116, ограждение из железобетонных панелей, инв. № 10115, благоустройство территории (дороги), инв. № 10079. Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18.

Нач. цена: 62 743,82 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 6274,38 бел. руб.

Лот. № 4. Кап. строение с инв. № 240/С-129651 площадью 27,9 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/10, наименование – здание склада, назначение – здание неустановленного назначения. Полигон ЖБИ, инв. № 7002, бетонный забор, инв. № 2031 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18.

Нач. цена: 1071,07 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 107,10 бел. руб.

Лот. № 5. Кап. строение с инв. № 240/С-46737 площадью 400,00 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18 наименование – здание учреждениеческое, назначение – здание административно-хозяйственное, инв. № 1004, составные части и принадлежности: подвал. Кап. строение с инв. № 240/С-34166 площадью 15,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18/1, наименование – здание проходной, назначение – здание неустановленного назначения. Сигнализация инв. № 7036, мини АТС, инв. № 4520, телефонная сеть, инв. № 3001, площадка для стоянки техники, инв. № 2003 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18.

Нач. цена: 20 612,14 бел.руб. без учета НДС. Задаток: 2061,21 бел. руб.

Лот № 6. Воздушные линии электропередачи по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, п. Высокое, ул. Новая, 18, воздушные линии электропередачи, протяженность линейного сооружения – 1188,1 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, инв. № 907.

Нач. цена: 27 776,40 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2777,64 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам **до 16.00 30.08.2022**. ***Сумма задатка по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г.Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».*** **Условия электронных торгов:** Победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП согласно прейскуранту ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета торгов. Имущественные права не зарегистрированы в установленном порядке на сети электроснабжения (лот № 1), наружную теплотрассу (лот № 3), здание учрежденческое, инв. № 240/С-4737 (лот № 5), воздушные линии электропередач (лот № 6) (имеются ведомости технических характеристик). В соответствии с п.п. 9.1. Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области» государственная регистрация создания объектов недвижимого имущества, право собственности на которые не зарегистрировано в установленном порядке на момент отчуждения, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на них осуществляется по заявлению покупателя (приобретателя), подаваемому не позднее двух лет со дня заключения договора купли-продажи (безвозмездной передачи), на основании технического паспорта. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения эл. торгов, отказаться от проведения эл. торгов. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by. Имущество бывшее в употреблении. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна, тел. +375292953541.

АЛЮМІНІЕВЫЯ АГУРКІ НА БРЫЗЕНТАВЫМ ПОЛІ

Чаму разгортваецца глабальная хваля пратэсту фермераў?

У Нідэрландах разгарнулася чарговая хваля фермерскіх пратэстаў з-за палітыкі ўладаў краіны па пытаннях экалогіі. Гэтым разам пратэстоўцы заблакіравалі некалькі аўтатрас, раскідаўшы па іх гной, сена ці смецце; пачаліся пажары. Пра гэта паведаміла Нідэрландская тэлерадыёвяшчальная карпарацыя (NOS). Урад краіны не збіраецца саступаць пратэстоўцам, нягледзячы на пагрозу харчовага крызісу. Адзначаецца, што дзеянні фермераў прывялі да вялікіх заторaў і аварый на аўтатрасах Нідэрландаў. Міністэрства сельскай гаспадаркі і прыроды Нідэрландаў лічыць, што фермеры зайшлі занадта далёка, паведаміла NOS. Паліцыя Нідэрландаў, у сваю чаргу, заклікае фермераў спыніць пратэсты. У сваёй заяве яны заўважылі, што такія дзеянні сур'ёзна пагражаюць бяспецы дарожнага руху і могуць прывесці да незваротных сітуацый. Сваіх нідэрландскіх калег падтрымалі сельгасвытворцы па ўсім свеце. Чаму разгортваецца глабальная хваля пратэсту фермераў, да чаго гэта можа прывесці?

ТРАКТАРЫ І ТАНКІ

Навіны з Нідэрландаў, якія традыцыйна ўяўляюцца спакойнай і заможнай краінай, з пачатку ліпеня ўсё больш нагадваюць зводкі з тэатра ваенных дзеянняў, адзначыў vz.ru. Галандскія фермеры і грамадзяне каралеўства, якія іх падтрымліваюць, перакрываюць аўтастрады і блакіруюць доступы да дзясяткаў гандлёвых цэнтраў і супермаркетаў. Пратэсты ахапілі ўсю краіну і перайшлі за яе межы ў суседнія еўрапейскія дзяржавы, а таксама перакінуліся нават праз Атлантыку (стала вядома, што канадскія сельгасвытворцы правялі акцыі салідарнасці).

«Вайна пачалася», — абвяшчалі гіганцкія транспаранты, разгорнутыя на «трактарных войсках». Цэнтральнае бюро гандлю харчаваннем Нідэрландаў (CBL), сур'ёзна напалоханае лічбамі шкоды гандлю, 4 ліпеня распаўсюдзіла заяву аб тым, што супермаркеты і кампаніі грамадскага харчавання не маюць ніякага дачынення да канфлікту фермераў і ўрада, і заклікала органы правасуддзя і паліцыю Нідэрландаў неадкладна ўмяшацца ў сітуацыю і пакласці канец блакадзе. Амстэрдамскі аэрапорт «Скіпхол» і авіякампанія KLM заклікалі пасажыраў карыстацца толькі грамадскім транспартам, каб своечасова трапіць на патрэбны авіярэйс.

Урад, які тыдзень таму цьмяна разважаў аб праве грамадзян на ўмераны пратэст у рамках закона — сам таго не падазраючы, у духу чэшскага сатырыка Яраслава Гашэка — ужо ўсвядоміў, што мае справу з арганізаваным пратэсным рухам, а не з разрозненымі акцыямі, адзначыў vz.ru. Традыцыйна нявызначаная рыторыка галандскіх еўрабюракратаў хутка змянілася на гатоўнасць дзейнічаць жорстка і задушыць пратэсты ўсімі магчымымі спосабамі.

Увечары 5 ліпеня паліцыя адкрыла прыцэльны агонь з табельнай зброі па калоне тэхнікі пратэстоўцаў на ўездзе ў Херэнвен — цэнтральны горад правінцыі Фрысландыя. Па волі выпадку ніхто з удзельнікаў акцыі не быў забіты або паранены, але некалькі фермераў было арыштавана на месцы. Заявы сілавікоў аб тым, што стральба пачалася з прычыны імклівага нападу трактарыстаў на паліцэйскія аўтамабілі, быў тут жа абвергнуты шматлікімі сведкамі, якія вылажылі відэазапісы з месца здарэння.

Узровень жорсткасці пратэстоўцаў дасягнуў такога напалу, што яны пачалі выкарыстоўваць у якасці зброі пратэсту не толькі аўтамабілі, трактары і грузавікі, але і больш небяспечную тэхніку — напрыклад, устарэлы, але яшчэ цалкам мабільны брытанскі танк «Шэрман», прыгнаны кімсьці з калекцыянераў.

У якасці баявой адзінкі танк пакуль што не ўжываўся, фермеры прымяняюць не менш радыкальную тактыку барацьбы — напрыклад, яны закідалі гноем загарадны дом міністра прыроды і азоту Хрысціяны ван дэр Вал-Зегелінк.

Аднойчы пратэстоўцы збудавалі з 400 трактароў лозунг «No farmers, no food» («Няма фермераў, няма ежы»). Узначалілі вулічныя акцыі актывісты руху «Фермерскія сілы самаабароны» (Farmers Defence Forse — FDF). На іх эмблеме — скрыжаваныя вілы. Яны абвясцілі збор ахвяраванняў на «баявы фонд і штрафы». Акрамя таго, FDF прадаюць сувеніры са сваёй сімволікай, у тым ліку футболкі з надпісам «Жонка байца фермерскай самаабароны».



«ТЭФЛОНАВЫ МАРК» ПРАМАХНУЎСЯ

У мясцовых СМІ і заявах некаторых апазіцыйных палітыкаў ужо адкрыта агучваецца тое, што падзеі, якія адбываюцца, з'яўляюцца нічым іншым, як «нідэрландскім паўстаннем фермераў». Пры гэтым асноўныя еўрапейскія медыя вельмі неахвотна паведамляюць аб тым, што адбываецца ў краіне — лідары па ўзроўні прадукцыйнасці і экспарту сельскагаспадарчых культур. Інфармацыя аб фермерскіх пратэстах падаецца вельмі скупа, агульнымі рысамі абмалёўваецца нагода для пратэсту, але старанна пазбягаецца дэталёвы разбор сапраўдных прычын фермерскага бунту — чарговы віток непрадуманай барацьбы еўрапейскіх урадаў за зялёную эканоміку.

Схема, па якой развіваліся падзеі, даўно перастала выклікаць здзіўленне ў тых, хто сочыць за займальным працэсам падпілоўвання Еўрасаюзам эканамічнага сука, на якім ён сядзіць, заўважыў vz.ru. Галандскі ўрад пад кіраўніцтвам Марка Рутэ, кіруючыся «каштоўнымі ўказаннямі» з Бруселя, прыняў рашэнне да 2030 года роўна напалову скараціць узровень забруджвання атмасферы і глебы. А атмасфера забруджваецца, у прыватнасці, угнаеннямі, якія выкарыстоўваюць фермеры. Нават гноем, напрыклад, бо ўгнаенні выдзяляюць азот. Але меншае выкарыстанне ўгнаенняў азначае падзенне ўраджайнасці, а значыць, збяднение фермераў.

Відавочна, што Рутэ, які знаходзіцца 12 гадоў ва ўладзе (прызваны «тэфлонавым Маркам» за ўменне «разрульваць» праблемы, што «адскоквaюць ад яго, быццам бліны ад патэльні») гэтым разам не разлічыў сілу народнага гневу, адзначыла news.ru. «Зялёныя» фантазіі брусельскіх чыноўнікаў распаўсюджваюцца на ўсе краіны Еўрасаюза, але галандцам у гэтых адносінах не пашанцавала значна больш за астатніх. Па-першае, як ні парадаксальна, з прычыны таго, што на працягу цэлага шэрага гадоў гэтая невялікая (4,2 мільёна гектараў, 131-е месца ў свеце па плошчы), але паспяховая еўрапейская краіна дэманстравала вельмі высокія паказчыкі па вытворчасці і экспарту сельскагаспадарчых матэрыялаў, па жывёлагадоўлі і аграрных тэхналогіях. Сельгасмашыны вытворчасці Нідэрландаў вядомыя ва ўсім свеце, галандскія фермеры з'яўляюцца прызнанымі лідарамі ў галіне насенняводства, у развядзенні элітных парод жывёлы і птушкі.

Гэтая краіна — другі па велічыні экспарцёр сельгаспрадукцыі ў свеце. Штогод Нідэрланды экспартуюць сельгаспрадукцыі амаль на сто мільярдаў долараў. «Лічбы цудоўныя, калі параўноўваць з іншымі найбуйнейшымі вытворцамі. ЗША стаяць на першым месцы з экспартам каля 150 мільярдаў долараў, але да Нідэрландаў не дацягвае, скажам, вялікая Бразілія з экспартам у 79 мільярдаў долараў і Кітай, чый экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі дасягае «ўсяго» 63 мільярды долараў», — піша харвацкае выданне Advance.

ЧАС РАСКІДВАЦЬ ГНОЙ

Адметна, што асновай аграпрамысловага сектара эканомікі Нідэрландаў з'яўляюцца невялікія сямейныя фермерскія гаспадаркі, амаль палова з якіх валодае зямельнымі ўчасткамі менш за 10 гектараў. Адпаведна, поле для экалагічных эксперыментаў над эканомікай і грамадзянамі было вельмі прасторным — яшчэ ў 2017 годзе дзяржаўны сакратар па эканамічных пытаннях і паплечнік Марка Рутэ Марцін ван Дам ганарліва заяўляў: «Made in the Netherlands — больш не брэнд выключна для цюльпанаў і сыру. Наша сусветная рэпутацыя ў сферы сельскагаспадарчых ведаў і тэхналогій працягвае расці».

Нязменны прэм'ер-міністр краіны Рутэ, лідар «Народнай партыі за свабоду і дэмакратыю» (Volkspartij voor Vrijheid en Democratie) выдатна падышоў на ролю таго, хто можа ўпарта і не азіраючыся ні на якія абставіны і страты, укараняць павестку, якая важная для ЕС тут і цяпер. Вельмі характэрна, што палітычным ідэалам Рутэ, паводле яго ўласных слоў, з'яўляецца брытанская «жалезная лэдзі» Маргарэт Тэтчэр, якая мела велізарны досвед у супрацьстаянні як інтарэсам уласных грамадзян, так і іх пратэстам.

Урад Нідэрландаў выдзеліў 24,3 мільярда еўра на фінансаванне сельскагаспадарчых рэформаў — нягледзячы на тое, што паводле ацэнак шэрага даследчых інстытутаў, уключаючы ўрадавыя, яны прывядуць да закрыцця амаль траціны жывёлагадоўчых фермаў у краіне. Ніякія аргументы сапернікаў гэтых паспешных крокаў па змаганні з «крытычным забруджваннем глебы» не браліся ў разлік. «Я ведаю, што гэта будзе мець каласальныя наступствы для фермераў, якія доўгі час жывуць у атмасферы нявызначанасці», — паўтарала міністр Ван дэр Вал. Абараняючыся, прадстаўнікі фермерскіх гаспадарак спрабавалі давесці ўраду, што абвінавачанні ў незваротнай шкодзе, якую яны наносяць прыродзе на думку ўрада, як мінімум непрапарцыянальныя. «Гэта жудасна. Але ў той жа час у нас няма іншага выбару», — чулі яны ў адказ ад міністра.

Жывёлаводы адыгрываюць адну з ключавых роляў у вытворчасці прадуктаў харчавання ў краіне, разарэнне і закрыццё фактычна адной трэці гаспадарак можа прывесці да катастрафічных наступстваў, аж да недахопу харчавання ў краінах, якія залежаць у пастаўках ад Нідэрландаў. Адказ Хрысціяны ван дэр Вал быў ізноў вычарпальна кароткім: «Прырода не можа чакаць». Але фермеры таксама не могуць чакаць, і іх смярдзючы перформанс на парозе дома Хрысціяны ван дэр Вал з'яўляецца наглядным прыкладам іх рашучага стаўлення да дзейнасці ўласнага ўрада.

«РУШЫМ НА РЫМ!»

Навучаныя горкім вопытам еўрапейскай салідарнасці, нідэрландскія фермеры разумеюць, што ў крызіснай сітуацыі іх прыбыткі будуць тут жа прынесеныя на алтар чыіх заўгодна інтарэсаў — прыродных ці агульнаеўрапейскіх. Тое ж самае разумеюць фермеры іншых еўрапейскіх краін, якія распачалі забастоўкі і акцыі пратэсту з салідарнасці са сваімі галандскімі калегамі.

Трактарныя дэманстрацыі адбыліся і ў Германіі, у Ніжняй Саксоніі. Іх арганізавала заснавальнік руху Land schafft Verbindung («Зямля аб'ядноўвае») Майку Шульц-Браерс. Яна вырошчвае буракі і бульбу, угнойваючы палеткі з дапамогай суседняй свінафермы, удакладняе Berliner Zeitung. З Вестфаліі многія фермеры адправіліся ў Нідэрланды, каб спыніць рэформу там, а не чакаць, пакуль яна прыйдзе ў Германію.

Бунтуюць італьянцы і палякі — з-за высокіх цэн на паліва і ўгнаенні. «Рух за зямлю і сельскую гаспадарку», які ўзначальвае Матэа Талярыка, патрабуе ад рымскага ўрада абараняць фермераў, а не буйны капітал. На думку актывістаў, цяперашні сумны стан аграрнага сектара — вынік памылковай палітыкі апошніх 30 гадоў. Італьянскія фермеры пратэставалі пад лозунгамі: «Мы не рабы, мы фермеры!», «Мы не можам звесці канцы з канцамі!», «Рушым на Рым!».

Адметна, што заходнія медыя пераходзяць на бок пратэстоўцаў. Напрыклад, Bloomberg адзначыла, што гной на 25 працэнтаў таннейшы за штучныя ўгнаенні, якія падаражэлі ўтрая. Брытанская The Guardian назвала палітыку ЕС «знішчэннем сельскай гаспадаркі». На думку выдання, усё скончыцца тым, што еўрапейцы будуць альбо галадаць, альбо «пачнуць харчавацца мухамі і чарвякамі».

Захар БУРАК.

Даслоўна

«ВЯСКОЎЦЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ГАЛОЎНЫМІ ГЕРОЯМІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на селектарнай нарадзе па пытаннях уборачнай кампаніі нагадаў аб «ашалелай сітуацыі ў свеце».

«Сітуацыя ў свеце з прадуктамі харчавання вельмі няпэўная. Падкрэсліваю, абсалютна няпэўная. У сувязі з ашалелай сітуацыяй у свеце, калі шчыра казаць, мы не ведаем, што будзе заўтра, і гэта самае небяспечнае. Шмат хто кажа аб тым, што мы напярэдадні голаду. Мы гэта адкідваць не можам і задаём сёння пытанне: а раптам? І калі голад, вы ведаеце яго наступствы. Таму нам трэба сабрацца. Гасподзь падарыў нам цудоўныя ўмовы надвор'я ў бягучым годзе, і мы павінны гэтым скарыстацца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«І, што немалаважна, я сказаў бы, вельмі важна, мы сёлета, калі спрацуем добра, можам нядрэнна зарабіць і папраўіць эканоміку сельскай гаспадаркі. Словам, сітуацыя вельмі сур'ёзная і, я сказаў бы, надзвычайная з пункту гледжання арганізацыі работ у вёсцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Я заўважыў, у сродках масавай інфармацыі і сёлета мы вяскоўцаў не крыўдзілі. Яны заўсёды прысутнічалі на тэлебачанні, у газетах, часопісах, інтэрнэце. Гэта правільна. Трэба і надалей сродкам масавай інфармацыі ўдзяляць вялікую ўвагу вяскоўцам. Яны павінны быць галоўнымі героямі. Не хлебам адзіным жыве чалавек. Усе хочуць, каб іх бачылі і адзначалі іх працу», — заўважыў беларускі лідар.

Прэм'ера

ВЫП'ЕМ ЗА КАХАННЕ?

У Вялікім тэатры сілкуюць пачуцці

Пабываць на марскім узбярэжжы ў самы разгар сезона, пажыць у сельскім гатэлі, назіраючы за яго насельнікамі, за інтрыгамі і драмамі, слухаць цікавыя гісторыі і мясцовыя плёткі, перажываць за тых, хто прагне кахання, і радавацца, калі ўсе навокал шчаслівыя... Самы лепшы занятак для тых, хто стаміўся і хоча адпачынку. Калі і не ў заморскім турнэ, то ў Вялікім тэатры — там усе гэтыя эмоцыі віруюць, бо вялікая частка опернай класікі — творы аб прыгожых пачуццях і шчасці, за якое змагаюцца героі. Асабліва гэтым вылучаюцца італьянскія оперы. А ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі пад канец сезона паставілі «Любоўны напой» Гаэтана Даніцэці. Пастаноўку ажыццявіла Ганна Маторная, якая ў канцы мінулага тэатральнага сезона стала галоўным рэжысёрам тэатра.

Абраць «Любоўны напой» — удалае рашэнне, асабліва цяпер, калі паездкі да мора здзяйсняць не надта проста, а зараджацца добрым настроем дужа хочацца. І гэта цалкам рэальна. Таму што опера, напісаная Даніцэці без малога два стагоддзі таму, з'яўляецца той класікай, да якой і ў нашы дні з задавальненнем звяртаюцца тэатры свету: бліскучая музыка плюс лёгкі сюжэт. Жанр — опера-буф — адразу задае настрой, на які могуць спадзявацца гледачы. Так і ёсць: у «Любоўным напоі», калі хто не ведае, вясёлы сюжэт, праўда, не без каліва суму. Але ж які гэта сум! Сусветным оперным хітом стала арыя Немарына з гэтай оперы — мне здаецца, адна з самых «раскручаных» мелодый (калі карыстацца сучаснымі словамі) за ўсю гісторыю сусветнай музыкі. Хоць раз, хоць урывак, хоць у зборным канцэрце ці па радыё, але яе можна было пачуць, нават не будучы аматарам оперных спеваў. І мне цяжка ўявіць чалавека, які, пачуўшы першыя гукі, захацеў бы выключыць такую прыгожую музыку. А вось цяпер ёсць магчымасць пачуць гэтую арыю ў самой оперы, разумеючы, адкуль жа такі адчай у галоўнага героя... камічнай оперы.

Інтрыга насамрэч даволі простая: ён — безнадзейна закаханы рыбак, а яна — гаспадыня пансіяната на марскім узбярэжжы Італіі. Але ж хто сказаў, што просты юнак не здольны на высокія пачуцці, якія выяўляюцца праз прыгожыя спевы? Аляксандр Міхнюк перадаў і пяшчоту, і боль, і надзею на спагаду. Але госці пансіяната, якім валодае Адэліна, — заможныя людзі. Яна — дзяўчына з гонарам, вытанчаная і гарэзлівая: характар гераіні здолела перадаць Ірына Кучынская. Яна разам з гасцямі бавіць час у свецкіх размовах. А яго суразмоўнікі — хіба што маўклівыя рыбіны, бо каму цікавы бедны юнак, калі ў курортным мястэчку столькі магчымасцяў для адзінокіх паненак? Карацей, без варыянтаў. Але не была б гэта італьянская опера!..

Праўда, на сцэне мы бачым усё ж не столькі Італію пачатку XIX стагоддзя. Рэжысёрскі падыход Ганны Маторнай адметны тым, што яна ўмее адысці ад літаральнасці і ўвасобіць твор з пэўнай ступенню ўмоўнасці, каб было больш блізка і зразумела сучаснаму гледачу — ну, усё ж XX стагоддзе на дварэ. Ідэю ёй дапамаглі рэалізаваць мастак-пастаноўшчык Андрэй Меранкоў, па волі якога мястэчка Адзіны і Немарына амаль лунае ў аблоках, што ахінаюць рамантыкай адносіны герояў. І мастачка па касцюмах Любоў Сідзельнікава дапамагла завяршыць карціну ўмоўнасці без прывязкі да часу, у які створаная опера. Касцюмы ў гэтай пастаноўцы адыгрываюць немалую ролю ў тым, каб стварыць атмасферу гламуру вакол Адзіны, тым самым падкрэсліць яе статус і засведчыць нерэальнасць надзей Немарына.

Таму мы назіраем за вельмі актыўным курортным жыццём, калі на ўзбярэжжы гуляюць дзеці, вытанчаныя паненкі штодня «выгульваюць» новыя сукенкі, нібыта прыехалі на тыдзень моды, а млявая на санцапёку публіка пад парасонамі шукае, чым бы пазабаўляцца. Тут удала задзейнічаны артысты хора, міманса і Дзіцячага тэатра-студыі (малыя на моры — асобны клопат дарослых і крыніца замілавання, што дадае жывінку).

Курорт карыстаецца попытам: таму людзей на сцэне шмат, і тут увесь час адбываецца нейкі рух. Трэба адзначыць, што Ганна Маторная прыцягнула ў якасці балетмайстра-пастаноўшчыка вучня Валянціна Елізар'ева Сяргея Мікеля, лаўрэата Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі. Яго работа на сцэне адчувальная, хоць, здаецца, якая можа быць харэаграфія ў оперы? Вось менавіта такая, каб італьянскі адпачынак на ўзбярэжжы не выглядаў статычным. Таму што паводле сюжэта насельнікі і госці мястэчка забаўляюцца тым, што з задавальненнем абмяркоўваюць цікавыя гісторыі з жыцця і з кніг. І гаспадыня пансіяната мае што прапанаваць гасцям: рамантычная меладрама пра Трыстана і Ізольду — тое, што можна слухаць пад шэпт хваль. Але амаль казачная гісторыя, уведзеная ў оперу, дае надзею Немарына: ёсць чараўніцтва, здольнае запаліць каханнем абраную дзяўчыну. І тут з'яўляецца прахіндзей Дулькамара (Андрэй Сялюцін) са сваёй экзальтаванай камандай і чароўным напоем, за які выдае звычайнае віно. Напэўна, калі выпіць бутэльку бардо, сапраўды чалавек можа раскрыцца з незвычайнага боку, што і адбываецца з рыбаком Немарына. На што толькі не пойдзе закаханы чалавек, каб звярнуць на сябе ўвагу! Вялікая рыбіна ў падарунак — гэта ж нічога асаблівага. А вось у войска ад безвыходнасці завербавацца, калі каханая выбрала бліскучага марака (партыю Белькарэ спяваў Дзяніс Янцэвіч) — гэта ўжо сур'ёзна. Дзявочае сэрца не вытрымала. Ну таму што... Можна было без напою. І без спадчыны для Немарына. Можна было. Але часам пачуцці гуляюць з людзьмі так, каб вадзіць іх доўгімі шляхамі. Ці не для таго, каб пасля яны больш даражылі сваім шчасцем?

Інтрыгі ў каханні — вечная гісторыя, таму і опера «Любоўны напой» не страчвае ўвагі пастаноўшчыкаў. У Беларусі яна не ішла больш за 50 гадоў. Ну так, ёсць оперы больш маштабныя, з ідэямі, што актуальныя, адпаведна, больш цікавыя для пастаноўшчыкаў. Але простае і лёгкае зрабіць цікава — задача не менш складаная для пастаноўшчыкаў. І не менш важная. Бо справа не толькі ў тым, што тут просты і зразумелы сюжэт — ён падаецца праз цудоўную музыку (дырыжор-пастаноўшчык Алег Лясун) і прыгожыя спевы. А ў людзей, бывае, здараецца такі этап у жыцці, калі ім патрэбнае аднаўленне эмоцый і сіл, у тым ліку праз музыку. І тады «Любоўны напой» — тое, што трэба, толькі ўжо ў новым 90-м сезоне Вялікага тэатра.

Ларыса ЦІМОШЫК.

КАЛІ ВЕРАЦЯНО ПЕРАМАГАЕ СЯКЕРУ

Выстава «Жаночы род» у Нацыянальным мастацкім музеі

У эпоху постмадэрнізму ўсе добра засвоілі, што новы, паўнавартасны твор можна зрабіць... з чужых. Выкарыстоўваючы як шкельцы ў вітражы ці ў калейдаскопе, разбіраючы на цытаты, спалучаючы ў розных варыяцыях, каб узнікалі новыя сэнсы...

Менавіта такімі постмадэрновымі творамі можна назваць выставачныя праекты вядучага навуковага супрацоўніка аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст. Нацыянальнага мастацкага музея Дзмітрыя Салодкага. Дазволена спрачацца, разважаць, медытаваць — але абыякавымі не сысці. Надоечы ў музеі адкрыўся новы куратарскі праект Дзмітрыя Салодкага «Жаночы род». Здавалася б, зацяганая тэма... Вобраз жанчыны ў мастацтве. Матэрыял таксама вывучаны — музейныя фонды. Але трапляеш у нечаканае. Міфапаэтычны свет, звернуты да архетыпаў, да нечага такога, что ляжыць у глыбінных пластах памяці... Тут не адчуваецца прысутнасці легкадумнага палкага Эраса, і нават яго вечнага ворага Танатаса... Тут — пра таямніцу жыцця ў Сусвеце. Творы, нават вядомыя, набываюць уражальную трактоўку... А творы — ад народных посцілак да сюрэалістычных палотнаў, час — ад неаліту да эпохі інтэрнэту... Паўзмрок, яркія светлавыя плямы на экспанатах, медытатыўная музыка... «Бабка-павітуха прымае нованароджанае дзіця. З верацяна маці і сякеры бацькі, што ляжаць побач, выбірае верацяно. Абгарнуўшы ім пупавіну, хуткім і ўпэўненым рухам здзяйсняе пераразанне. Абрад ініцыяцыі выкананы. З гэтага моманту жаночы род становіцца багацейшым яшчэ на адну прадстаўніцу, прымаючы ў свой свет будучую нявесту, жонку, маці і гаспадыню. На гэты раз сякера саступае верацяну. На гэты раз верацяно!»

Такімі словамі пачынаецца расповед пра выставу... Дзевяноста пяць твораў, дзевяноста пяць шкельцаў у цёмнай трубе калейдаскопа... Ды яшчэ падзеленыя на два залы — «Жаночы» і «Род». Адкрываюць экспазіцыю два творы, якія сягаюць да пракаветнасці. «Формы нёманскай культуры» Тамары Васюк — гэта і знойдзены ў раскопе гліняны сасуд, і жаночая фігура, архаічнае боства плоднасці і аховы роду... Карціна Гаўрыіла Вашчанкі «Сведкі» — постаці старых жанчын у намітках-хустках, прычым профіль на пярэднім плане нагадвае Стэфанію Станюту. А самі постаці — піраміды, абеліскі, скалы, нешта, непадуладнае часу, нязменнае пад сонцам.

Гадзінамі можна разглядаць малюнкі цудоўных беларускіх народных строяў, выкананыя Лявонам Баразной і Міхасём Раманюком... Карціна Кішчанкі — беларуская жанчына, якая нясе сухое галлё — успрымаецца як ілюстрацыя да міфа наконт стварэння свету... Вышыванкі і скульптурныя партрэты... Размаляваныя гліняныя лялькі і жывапіс... А вось і верацяно. У асобнай зашклёнай скрынцы. У атачэнні карцін Сяргея Рымашэўскага і Вольгі Мельнік-Малахавай з выявамі маладых жанчын. Гэткае кола вакол верацяна, вячоркі-папрадухі...

Наступная зала, «Род», — гэта пра супрацьстаянне Жанчыны і Смерці... Вось палескі абраз 1666 года Маці Божай Адзігітрыі, заказаны рабой Божай Ульянай за свой душэўны спакой і за памерлых дзяцей яе Марыю, Іаана і Стафана. Унізе абраза, за постаццю Багамаці, намаляваныя і гэтыя дзеткі — дзяўчынка і два хлопчыкі... Можна толькі ўявіць гора тае Ульяны, якая шукае ратунку ў Маці Божай, што прытуліла і яе дзетак...



Жанчына — захавальніца Роду... Цэнтральная скульптура экспазіцыі — цяжарная, якая трымае ў руках хлеб. Бохан па форме дакладна паўтарае яе жывот, у якім нараджаецца новае жыццё...

Вайна, Чарнобыль... Страта мужчыны. Адвечная задача маці — пракарміць сям'ю. Адзець сямейных. Аздобіць побыт. Карціны мастакоў савецкага часу, якія адлюстроўваюць сялянскую працу, у такім кантэксце набываюць іншае, архетыповае, гучанне. Вясельнае пакрывала «Мятліца» 1920-х гадоў невыпадкова ў адной экспазіцыі з графічным малюнкам Яўгена Куліка з выявай жнейкі, з подпісам: «Толькі ў жніво, ды ў касьбу, і на ніве, і ў лузе бела ад хустак, намітак, кашуль і бравэрак». А ці не ў гэтых кашах для збожжа пасярод залы захоўваўся плён працы тае жнейкі?

Выстава будзе дзейнічаць да 1 кастрычніка. Схадзіце, паглядзіце, паразважайце... Бо гэта пра тое, што ўцямна кожнаму: пра каштоўнасць жыцця, яго нетрываласць і неперарыўнасць, пра повязь пакаленняў, пра чалавецтва і Беларусь.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Памяць

Валянціна Куляшова. Пісьмы з «Артэка»

Імя народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова назаўсёды застанецца ў біяграфіі нашай Айчыны. Некалькі дзесяцігоддзяў таму другі народны паэт — Пімен Панчанка — напісаў пра свайго паплечніка па літаратурных сцяжынах: «Паэзія Аркадзя Куляшова з гадамі не старэе, а набывае яшчэ большую моц, сілу і харство. Яго вершы і паэмы — адзін з самых каштоўных скарбаў нашай літаратуры». І далей: «Суровая, але чалавечная, крыштальна праўдзівая, вогненная і пяшчотная, напоеная ўсёй духмянасцю беларускай зямлі, паэзія Аркадзя Куляшова будзе жыць. Яго імя — у тым вялікім сузор'і, дзе гараць і свецяць зоркі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча».

Здымак зроблены ў 1960 годзе. Валянціна злева каля бацькі.

Хіба ж могуць забыцца тыя творы, дзе ў кожным радку відаць суладнасць паэта са сваім народам, сваёй Айчынай?! Як і гэтыя радкі: *«Мне кожны год, нібы жыццём другім,/ Жыць у дваццаты век наш давялося.../ Я — акіяну жытняга калоссе: / Мільёны лёсаў змешчана ў маім, / Яшчэ да дна не вычарпаным лёсе...»*

Кожная драбнічка, звязаная з гісторыяй лёсу і творчасці народнага паэта, падаецца сёння надзвычай значнай. Кожная драбнічка выяўляецца характарыстыкай яго жыцця. У якім, пэўна ж, асаблівую ролю адыгрывалі блізкія Аркадзю Аляксандравічу людзі. Сярод іх — і дачка Валянціна Аркадзеўна Куляшова (1936 — 2018), літаратуразнавец, перакладчыца. А самае, відаць, галоўнае, што зроблена дачкой паэта, — яе кніга «Лясному рэху праўду раскажу...» Упершыню выдадзеная ў 1989 годзе, яна і сёння застаецца ўнікальным дакументальна-мастацкім дакументам у дачыненні да біяграфіі Аркадзя Куляшова.

Некаторы час таму да мяне трапілі (ад аднаго з калекцыянераў, які выпадкова набыў гэтыя сведчанні часу на клубе калекцыянераў) два аркушыкі разам з канвертам: пісьмы школьніцы Валянціны Куляшовай з піянерскага лагера «Артэк». Лісты датаваны 1951 годам... На канверце, які ў два разы меншы, чым звычайны сённяшні паштовы канверт (а ліст, што ў ім знаходзіўся, складзены напалову, — па фармаце амаль на чвэрць меншы ад ліста паперы А4). Вось што піша дачка паэта сваім родным (цытую на рускай мове, як у арыгінале) 24 ліпеня 1951 г.: *«Здравствуйте, дорогие мама, папа, Вова и Саша! Почему вы мне не пишете? Уже 24-го, а я не получила от вас еще ни одного письма. 22-ого у нас было открытие лагеря. День прошел очень интересно. После завтрака мы купались в море. Меня не укачало. После полдника у нас была торжественная линейка, а затем художественная самодеятельность. Я в числе четырех девочек из Белоруссии пела «Мы Белорусы», «Падзяка Сталину», представляете, как это у меня получалось? Ну ничего, всё сошло благополучно. В 7.30 начался праздничный ужин. Все столы были составлены вместе и на них стояли разные кушанья: сыр, колбаса, помидоры, винегрет, рис с котлетой, пирожные, груши, конфеты. За столом было очень весело: все пели, кричали, стучали вилками и кулаками. В общем нам было разрешено делать что хочешь (Чего нам не разрешают обычно). После ужина были танцы и игры. 23-го у нас начали работать кружки. Я пошла в рукодельный. В морской не пошла, так как в два невозможно. Зато записалась в две секции: волейбольную и плавания. Хотела написать вам вчера, но не успела. Постарайтесь купить мне учебники. Больше пока что писать нечего.*

До свидания. Валя.

Привет девочкам.

Был ли в Минске футбол?

24/ VII — 51 г.»

...Куляшоў напісаў у 1951 годзе верш «Маё пасведчанне»:

Дадзена яно сабе самому
Ў тым, што нарадзіўся ў год вайны.
Нянек не было ў мяне, вядома,
Песень не спявалі мне яны.

Думала вайна, як кананадай
Лепей ёй мяне закалыхаць;
Клапацілася, як лепш блакадай
Рукі мне і ногі спелянаць.

Шмат вайной людзей закалыхана,
Многа спіць іх у зямлі сырой.
Выйшаў я на бой смяротны рана
З нянькаю няпрошанай людской.

Колькі раз мне на гарах, на сопках
Засціпала свет вайны імгла?
Колькі раз паставіць куля кропку
Пад маім пасведчаннем магла?

Зведаў я ўсе бітвы на планеце,
Кожны дзень ішоў з агню ў агонь.
Трыццаць сем гадоў жыву на свеце —
Болей чым трынаццаць тысяч дзён.

У канцы 1940-х — у першай палове 1950-х гг. Аркадзь Куляшоў быў на творчай рабоце. У 1946 годзе ён пакінуў пасаду галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». У 1945—1951 гг. убачылі свет кнігі паэта «На сотай вярсце», «Вершы», «Паэмы», «Выбраныя вершы і паэмы», «Камуністы», «Выбраныя творы» (двойчы — у 1947 і 1951 гг.), пераклад рамана ў вершах А. С. Пушкіна «Яўгеній Анегін». Напружанасць, з якой працаваў паэт, уражвае. Зразумела, што сям'я жыла ў атмасферы гэтай нястомнай творчасці.

...З ліста Валянціны ад 26 ліпеня 1951 г.: *«Здравствуйте, дорогие мама, папа, Вова и Саша!*

24-го я написала вам, что больше писать нечего, но только я опустила его в ящик, как к нам пришла делегация. В этой делегации были немцы, монголы, румыны и др. Они побывали в наших спальнях, поговорили с нами и ушли. 25-го (это вчера) мы ездили на экскурсию по Южному берегу Крыма. Сперва мы были в Ялте в домике А. П. Чехова. Там мы познакомились с его сестрой Марией Павловной. Ей уже 88 лет. Мы поговорили с ней и сфотографировались. Из Ялты поехали в санаторий «Жемчужина». Там мы видели «Ласточкино гнездо», санаторий Киевского военного округа «Кичкиме», в переводе на русский «Малютка»! Так он называется потому, что он действительно небольшой этот санаторий, расположен во дворце, который принадлежал раньше Петру Николаевичу Романову. Во время войны Гитлер подарил его одному из своих приближенных, поэтому он уцелел. Потом мы были в Мисхорах. Там пообедали и поехали в санаторий «Красное знамя» ЦК партии. Этот санаторий расположен во дворце того же П. Н. Романова «Дюльбер», что в переводе на русский «наипрекраснейший». Этот дворец оправдывает своё название — он действительно очень красивый. Построен он в мавританском стиле. В архитектуре его не соблюдено никакой симметрии. Мы побывали внутри комнат этого санатория. Разноцветные. Одна голубая, другая сиреневая и т. д. В том санатории мы видели секретаря бельгийской компартии и его жену с девочкой. Из этого санатория мы поехали в санаторий «Курпаты». После «Дильбера» «Курпаты» не произвели на нас особого впечатления, но это не значит, что это плохой санаторий.

В Ялте я купила 8 открыток. 1-я Кутузовский фонтан близ Алушты. 2-я Памятник затопленным кораблям в Севастопольскую оборону 1854 — 55-х гг. 3-я санаторий «Олеандра» в Ялте. 4-я Крым «Русалка». 5-ая Беседка в Никитском ботаническом саду. 6-ая Крым. Гурзуф. Фонтан «Ночь». 7-ая «Дюльбер» Фонтан «Умирающий лебедь». 8-ая Крым. Беседка близ Алупки.

В каждом санатории мы фотографировались. В то время, как мы ездили по санаториям, приехали в «Артек» китайцы. Они разместились в нашей 4-ой даче на этаже как раз напротив нас. Приехав в «Артек» (это было уже в 10-м часу), мы поужинали и пошли на дачу. Там мы встретились с китайцами. Поговорили с ними немного и пошли спать. Это было вчера, а сегодня нам сказали написать сочинение об экскурсии, а у меня никак не получается. Вот сидела только что и писала, а так как ничего не выходит, решила написать вам письмо. Сейчас закончу и снова примусь за сочинение.

Привет всем.

До свидания.

Валя».

Захапляльныя старонкі памяці з летняга адпачынку падлетка з сям'і ўжо на той час славутага, вялікага пісьменніка. Таго, які ў яе пару (ці нават крыху раней — у 14 гадоў) напісаў верш, што ўжо не адно дзесяцігоддзе гучыць як песня: *«Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая. / Чаму так горка, не магу я зразумець. / Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае / На ўсходзе дня майго, якому ружавець. / Ці помніш першае нясмелае прызнанне?.. / Над намі жаўранкам звіней і плакаў май. / Назаўтра золкае, туманнае світанне. / Суровы позірк твой і мой нямы адчай...»*

Відаць, розная свядомасць, рознае захапленне і асэнсаванне клаліся на паперу ў паэта і яго дачкі... Бо менш як праз два гады, калі Валянціна была ашаломленая трагічнай падзеяй, пачуўшы навіну пра смерць Сталіна, бацька Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў сказаў — як адрэзаў... Успамінае Валянціна Аркадзеўна: «Калі ж 5 сакавіка 1953 года я пачула па радыё, што памёр Сталін, і кінулася ў кабінет да бацькі, ён жорстка адрэзаў: «Не смей плакаць!»

І ўсё ж лісты з «Артэка» падаюцца па-свойму цікавым эпісталярным дакументам часу. А ў звязку з тым, з якой сям'і іх аўтар, каму яны былі адрасаваны, выклікаюць яшчэ большую цікавасць.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Праект «Мастак і горад» пачаў работу

У Мінску адзначаецца 100-гадовы юбілей Міхаіла Савіцкага

Традыцыйным для жыхароў Мінска стаў праект «Мастак і горад» — выстаўка, якая ладзіцца пад адкрытым небам і знаёміць жыхароў і гасцей сталіцы з творчасцю вядомых прадстаўнікоў айчыннага выяўленчага мастацтва. За час работы культурнай ініцыятывы на вуліцах горада з'яўляліся выстаўкі работ Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Мікалая Селяшчука, Зоі Ліцвінавай, Георгія Скрыпнічэнкі, Леаніда Шчамялёва. Адзінаццаты сезон праекта прысвечаны творчасці народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага. Сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня яго нараджэння.

У экспазіцыю, што размясцілася на пешаходнай вуліцы Камсамольскай, увайшлі 34 работы, 15 з якіх створаны самім Міхаілам Савіцкім. Астатнія работы напісаны яго вучнямі. Амаль 30 гадоў свайго жыцця мастак прысвяціў педагагічнай дзейнасці — у год юбілею абмінуць гэты факт было немагчыма. Дзякуючы намаганням майстра, у Мінску з'явіліся Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры. У іх паслядыпломную адукацыю атрымала некалькі пакаленняў таленавітых беларускіх мастакоў.

Аўтарам пакінулі права самастойна выбіраць карціны для экспазіцыі. У яе ўвайшлі рэпрадукцыі твораў розных напрамкаў — некаторыя з іх прысвечаны Мінску, на іншых адлюстраваны беларускія пейзажы, як распавяла дырэктар Музея гісторыі горада Мінска Галіна Ладзісава. Удзельнікамі выстаўкі сталі вядомыя беларускія жывапісцы Віктар Альшэўскі, Ігар Бархаткоў, Уладзімір Ганчарук, Віктар Дубрава, Раман Заслонаў, Уладзімір Кожух.

— Імя Міхаіла Савіцкага — знакавае для беларускага выяўленчага мастацтва. У творах мастака адлюстраваны не толькі яго ўласны лёс, але і важныя гістарычныя падзеі, якія выпалі на долю ўсяго беларускага народа ў другой палове XX стагоддзя. Асноўнымі тэмамі яго творчасці сталі трагедыя Вялікай Айчыннай вайны, партызанскі рух, мірнае жыццё і стваральная праца, мацярынства, біблейскія сюжэты, экалогія і чарнобыльская тэхнагенная катастрофа, — адзначыла Галіна Ладзісава.

Рэпрадукцыі карцін былі прадастаўлены фондамі Музея гісторыі горада Мінска, Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна будзе да 30 верасня.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота БелТА.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот № 1 (одним лотом)
Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1, 1/1 – 1/3**

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инвентар. номер
Здание специализир. иного назначения (АБК)	1565 кв. м	640/С-25904
Здание специализир. иного назначения (производственный корпус)	3194,6 кв. м	640/С-25908
Здание специализир. иного назначения (здание механической мойки)	293,4 кв. м	640/С-25911
Здание специализир. иного назначения (здание автозаправочной станции)	31,9 кв. м	640/С-25949

Сведения о земельном участке: пл. **1,9846** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов администрат. назначения. Ограничения (обременения): расположен на природ. территориях, подлежащих спец. охране (в зоне санит. охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санит. охраны в местах водозабора)

Обременения: площади зданий с инв. № 640/С-25904 и 640/С-25908 частично сданы в аренду

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 989 808,00 бел. руб.

Лот № 2 (одним лотом)
Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Железнодорожный 1-й, 21/1 – 21/3**

Склад 1978 г. п.	570,9 кв. м	640/С-59616
Склад 1954 г. п.	648,5 кв. м	640/С-59618
Бытовка 1978 г. п.	59,8 кв. м	640/С-59619
Здание гаражей	49,5 кв. м	640/С-60236

Сведения о земельном участке: пл. **0,7113** га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.05.2030) для содержания и обслуживания зданий и сооружений

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 119 256,00 бел. руб.

Лот № 3 (одним лотом)
Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1А

Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-техніч. снабжения (состав. части – 3 навеса)	5375 кв. м	640/С-1801
Железная дорога	254,2 м	640/С-109925
Проходная (состав. части – навес)	37 кв. м	640/С-27612
Станция пожаротушения (состав. части – подвал)	100,8 кв. м	640/С-27613

Сведения о земельном участке: пл. **2,0419** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 1 470 797,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Лоты № 1, № 3 – 50 % от стоимости предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дней со дня заключения договора купли продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев.
Лот № 2 – оплата предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дня с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 1,5 (полтора) процента от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.05.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 16.08.2022 в 11.00. Окончание торгов: 16.08.2022 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении **10 августа 2022 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

Сведения о продаваемом имуществе	
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Капитальное строение с инв. номером 500/С-15435 общей площадью 1 871,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 70А, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание производственно-бытового корпуса, составные части и принадлежности; асфальтное покрытие на ул. Карла Либкнехта, 70А в Минске с инв. номером по бух. учету 01-450809; забор металлический с инв. номером по бух. учету 4801249; забор металлический с инв. номером по бух. учету 4801250; кран-балка с инв. номером по бух. учету 01-450811; кран подвесной 1т с инв. номером по бух. учету 01-400012; капитальное строение с инв. номером 500/С-39074 общей площадью 50,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 70А/1, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – аккумуляторная
Сведения о земельном участке	Право аренды на земельный участок по 31.03.2032, площадь – 0,5704 га, кадастровый номер 500000000005006178, целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания зданий специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, специализированных зданий иного назначения
Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС: 1 490 762,05 бел. руб.	**Сумма задатка**: 149 000,00 бел. руб.
Ограничения (обременения): аренда	

Продавец имущества – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 10.08.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 10 мая 2019 г. № 169 «О распоряжении государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **10 августа 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 01.08.2022 **по 08.08.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017) 224 81 14, (017) 355 41 11.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 224 81 14, (017) 355 41 11 (ОАО «Минскремстрой»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	**ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н. Сайт в интернете: www.iin.by**
Продавец	**ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29**
Ранее опубликованное извещение о проведении публичных торгов (аукциона)	Извещение о проведении публичных торгов опубликовано 07.07.2022 в газете «Звязда»

Предмет публичных торгов (аукциона)

Лот №	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %
1	**Производственное швейное оборудование**	250 872,00	61 904,77
1.1	**Автоматизированный раскройный комплекс ATOM FC 3010DP**	99 280,00	25 714,29
1.2	**Автоматизированный раскройный комплекс ATOM 888L30**	80 464,00	20 476,19
1.3	**Автоматизированный раскройный комплекс ATOM 888L30**	71 128,00	15 714,29

Задаток 10 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP 30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг аукциона на повышение – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» https://iin.by/torgi_18/

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу: www.iin.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота **в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона):	**начало торгов: 11.00 10.08.2022 г. по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н**
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 09.08.2022 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. E-mail: e.pinchuk@iin.by**

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

опубликованную в газете «Звязда» от 17 декабря 2021 года, с изменениями и дополнениями, опубликованными в газете «Звязда» от 18.02.2022 г., 26.05.2022 г., 09.07.2022 г.

по объекту «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин»

Внести следующие изменения и дополнения в текст проектной декларации:

1. Строку «62 (шестьдесят две) однокомнатных квартиры, расположенных в жилой секции 1/2 (по проекту):» заменить на «63 (шестьдесят три) однокомнатных квартиры, расположенных в жилой секции 1/2 (по проекту):».

2. Перечень однокомнатных квартир, предлагаемых к приобретению по договору создания объектов долевого строительства, дополнить квартирой:

«- 1 (одна) однокомнатная квартира по проекту № 85 общей площадью по проекту 103,29 кв. метров на 6 этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1970,00 долларам США»;

3. Сведения в отношении объекта долевого строительства «1 (одна) однокомнатная квартира по проекту № 84 общей площадью по проекту 144,17 кв. метров на 6 этаже», содержащиеся в перечне однокомнатных квартир, предлагаемых к приобретению по договору создания объектов долевого строительства, изложить в следующей редакции:

«- 1 (одна) однокомнатная квартира по проекту № 84 общей площадью по проекту 144,17 кв. метров на 6 этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1870,00 долларам США».

4. Абзац «В организации действует система скидок, зависящая от общей площади объекта долевого строительства, размера первоначального взноса, периода рассрочки и графика внесения платежей» изложить в следующей редакции: «В организации разработано положение о регулировании стоимости объекта долевого строительства в соответствии с которым цена объекта долевого строительства может быть снижена по соглашению сторон при заключении договора создания объекта долевого строительства в зависимости от общей площади объекта долевого строительства, размера первоначального взноса, периода рассрочки и графика внесения платежей».

УНП 691532819

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Борисовдрев»** (УНП 600012256), объявляет о проведении **31.08.2022 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/07/spisok-imushhestva-oao-borisovdrev.pdf

Продавец: **ОАО «Борисовдрев»**

Организатор торгов: **ЗАО «БелБанкротАукцион»,** 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **30.08.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **01.08.22** по 17.00 **30.08.22** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор **3 %** от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 календарных дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 10 календарных дней с даты проведения торгов.

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк строгой отчетности по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств» формы ОГО, серии МА № 5088783 в количестве 1 экземпляра **считать недействительным.**

УНП 100122726

Слова пісьменніка

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

З часам я даведваюся, што працягваецца падрыхтоўка з'езда настаўнікаў. Мяне з гэтай нагоды не трывожаць, пра маё выступленне на з'ездзе ніхто не гаворыць, я спакойна займаюся сваёй працай. На з'ездзе мяне запрашаюць у прэзідыум. Я лічу гэта ацэнкай маёй працы ў час выбараў Прэзідэнта. Адчуваю сябе добра, ужо ведаю многіх рэктараў, вітаюся з імі, абменьваюся ўражаннямі. Але ў перапынку да мяне падыходзіць начальнік упраўлення выхавацкай работы Міністэрства адукацыі Георгій Аляксеевіч Бутрым:

— Аляксандр Міхайлавіч, вы заўтра выступаеце на з'ездзе?

Я шакіраваны нечаканасцю пытання. Мне пра гэта ніхто не сказаў! А заўтра з'езд працуе ў прысутнасці Прэзідэнта. Кажу Бутрыму:

— Першы раз ад вас чую! Адкуль вам гэта вядома?

— Сам бачыў вас у спісе выступоўцаў!

У прэзідыуме пытаюся ў Брыгадзіна:

— Гэта праўда, што я заўтра выступаю?

— Так! — пацвярджае міністр. — Скажаш некалькі слоў.

Пасля гэтага я ад работы з'езда адключыўся, не пайшоў на секцыйныя пасяджэнні, адмовіўся ад вячэрняга прыёма ў міністра для рэктараў. Рыхтаваўся да выступлення. Канчатковы варыянт у мяне склаўся да чатырох гадзін раніцы. І ні з кім жа не параіўся, нікога не запытаеш. Выступаў я па рэгламенту дзесяць хвілін, гаварыў пра задачы камплектацыі настаўнікамі сельскіх школ, пра мэтавы прыём абітурыентаў, пра вартаснае забеспячэнне якасці вучэбнага працэса ў ВНУ, ПТВ і школах. Відаць, мае думкі былі сугучны з тым, што думаў з гэтай нагоды Прэзідэнт. У сваім выступленні ён некалькі разоў на мяне спаслаўся, пагадзіўшыся з маімі довадамі. У гэты дзень з'езда я як выступоўца таксама сядзеў у прэзідыуме, і пасля абвяшчэння перапынку да мяне падышоў Аляксандр Рыгоравіч. Запытаўся:

— Ты ўжо перайшоў?

Я зразумеў, што Прэзідэнт у курсе ўсіх маіх спраў. Адказваю:

— Аляксандр Рыгоравіч, я ж толькі пачаў працаваць рэктарам. Мы вызначылі планы развіцця ўніверсітэта, калектыў іх падтрымаў, мне паверылі. Трэба ж хоць бы нейкія рэзультаты атрымаць!

— Колькі ты працуеш рэктарам?

— Яшчэ сем месяцаў.

— Ужо сем месяцаў? Пераходзь на прапанаваную пасаду, а пасля і далей паглядзім.

Усё вырашана. Я зразумеў, што пераход на пасаду намесніка міністра непазбежны. Мне выдалі медыцынскую даведку на прафесійную прыгоднасць, я прайшоў усе ўзгадненні, заставалася толькі сустрэча з Прэзідэнтам перад прызначэннем. Але за дзень да гэтага мяне запрашае Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Урал Рамдракавіч Латыпаў і кажа, што Прэзідэнт дае мне магчымасць яшчэ папрацаваць рэктарам. Як жа мне былі патрэбныя і карысныя гэтыя тры гады ва ўніверсітэце. Яны далі мне надзвычай неабходны ў далейшым жыцці вопыт працы першай асобай.

Маё прызначэнне міністрам адукацыі ў жніўні 2003 года таксама было нечаканым і імклівым, на працягу трох дзён. Брыгадзін сам папрасіўся ў адстаўку, што дапамагло мне на першым часе выбудаваць адносіны з апаратам міністэрства, а з Пятром Іванавічам захаваць сяброўства да яго апошніх дзён.

У размове пры маім прызначэнні Прэзідэнт запытаўся, каго я бачу сваім пераемнікам. Я назваў дзве кандыдатуры — першага прарэктара прафесара М. І. Вішнеўскага і рэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі дацэнта К. М. Бандарэнку. Аляксандр Рыгоравіч падрабязна распытаў пра абодвух. Міхаіл Іванавіч у большай ступені бачыўся кіраўніком-вучоным, Канстанцін Міхайлавіч — кіраўніком-гаспадарнікам. Пры гэтым я выказаў сваю пазіцыю, што рэктарам павінен быць доктар навук. Прэзідэнт ведаў Бандарэнку яшчэ са студэнцкіх гадоў — яго армейскае мінулае ў пагранічных войсках, выдатную вучобу, настойлівы характар, актыўную працу ў яго палітычнай камандзе яшчэ на прэзідэнцкіх выбарах у 1994 годзе. Таму з нагоды доктарскай дысертацыі заўважыў: захоча — зробіць! Рэктарам быў прызначаны Бандарэнка. На гэтай пасадзе ён працаваў 14 гадоў, вельмі шмат зрабіў для развіцця ўніверсітэта, асабліва яго матэрыяльнай базы. І абараніў па гісторыі расійскіх палітычных партый доктарскую дысертацыю, нават адкрыў ва ўніверсітэце савет па абароне кандыдацкіх дысертацый для гісторыкаў.

З Косцем мы сябравалі яшчэ са студэнцкіх гадоў, але кіраваць універсітэтам я яму не перашкаджаў. Здаралася, што рабіў заўвагі за пралікі, але пры гэтым ніколькі не саромеўся, бо ў свабоде яго не абмяжоўваў. Некаторыя рашэнні ён прымаў не так, як я, часам іначай расстаўляў акцэнты. Гэта ўжо быў іншы рэктар, можа быць, у нечым горшы, але ў нечым і лепшы за мяне. Рэктарам ён працаваў з 2003 па 2017 год. Сышоў з гэтай пасады сам, са мною не раіўся. На маё шчырае здзіўленне з гэтай нагоды адказаў: проста стаміўся. У пераемнікі прапанаваў свайго вучня — першага прарэктара, доктара гістарычных навук, прафесара Дзмітрыя Сяргеевіча Лаўрыновіча. Але кіраўніцтва вырашыла іначай: рэктарам Магілёўскага ўніверсітэта прызначылі першага прарэктара Полацкага ўніверсітэта, доктара гістарычных навук Дзяніса Уладзіміравіча Дука. Рэктар Полацкага ўніверсітэта Дзмітрый Мікалаевіч Лазоўскі выказваў з гэтай нагоды шкадаванне — ён рыхтаваў Дука на сваё месца. А мой ўніверсітэт цяпер працягвае сваё развіццё пры новым кіраўніку.

Калі я працаваў ужо памочнікам Прэзідэнта, у размове са мною Аляксандр Рыгоравіч сказаў:

— Пагадзіся, што адна з самых прывабных для цікавай працы пасад — рэктарская.

Я сказаў:

— Я працаваў рэктарам, таму магу пацвердзіць вашу думку. Болей таго, шчыра скажу, калі б не да вас, то міністрам з пасады рэктара ніколі б не пайшоў!

Прэзідэнт на гэта толькі ўсміхнуўся.

Рэктары галоўнай педагагічнай ВНУ

Так склалася, што найболей для мяне блізкім, пасля Магілёўскага педінстытута, стаў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага, пазней Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка (БДПУ). Там я вучыўся ў аспірантуры, абараняў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, удзельнічаў у шматлікіх навуковых канферэнцыях. Зразумела, што з цягам часу назбіраў у гэтым універсітэце блізкіх сяброў. Да мяне першапачаткова прыязна ставіліся загадчык кафедры матэматыкі і методыкі яе выкладання І. А. Новік, прафесар-алгебраіст Л. Б. Шнеперман, дэкан матэматычнага факультэта прафесар-геаметр А. Б. Васілеўскі, франтавік, прафесар-педагог М. К. Сцепаненкаў. Стасункі з імі як з настаўнікамі непрыкметна перараслі ў дружбу. Надоўга сяброўскія адносіны завязаліся і з маімі равеснікамі, аднакашнікамі па аспірантуры, нарэшце, што цалкам натуральна, не толькі з фізікамі-матэматыкамі. Ужо прарэктарам я сыйшоўся з прарэктарам па навуковай рабоце Васілём Аляксандравічам Бондарам. Выдатны фізік, пераканаўчы настаўнік, аўтар многіх вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, да ўсяго астатняга мінчанін — мне з ім было заўсёды і ва ўсім надзвычай цікава. Разумны, вытрыманы, інтэлігентны, ён адчуваў усе глыбінныя цячэнні як ва ўніверсітэце, так і ўвогуле ў краіне. А час развіцця нашай дружбы быў гарачым, гэта пачатак дзевяностых! Час краху ранейшых ідэалаў і няўклюдныя спробы пошуку новых. Памятаю, як аднойчы мы стаялі ля акна яго кабінета ў шматпавярховіку на плошчы Незалежнасці і моўчкі пазіралі на натоўп людзей, якія доўга хадзілі замкнутым колам на гэтай плошчы і агрэсіўна нечага патрабавалі. Мы абодва ўсведамлялі правакацыйныя намеры арганізатараў такіх мерапрыемстваў і цяжка ўздыхалі, разумеючы сваю бездапаможнасць у тым, каб спыніць дзеянні дэканструктыўна настроенага натоўпу.

Васіль Аляксандравіч навучыў мяне прадбачыць магчымыя козні, правакацыі нават з боку блізкіх сяброў, асабліва калі ты яшчэ і іх кіраўнік. Напрыклад, ён не прыйшоў на мой банкет пасля абароны доктарскай дысертацыі. На самой абароне, канешне ж, быў, павіншаваў, а на традыцыйны з гэтай нагоды банкет не пайшоў. Усе ж ведалі пра нашу дружбу, а ён не прыйшоў. Толькі з-за таго, што як прарэктар курыраваў работу ўсіх саветаў па абароне дысертацый, а банкеты тады катэгарычна не віталіся. І быў жа абсалютна правым! Колькі светлых галоў паляцела пасля заяў «добразычліўцаў» аб удзеле кіраўніка ў калектыўнай п'янцы. Дарэчы, у мяне з банкетам з нагоды прысваення вучонай ступені кандыдата навук таксама была гісторыя, з якой я так да канца і не разабраўся. Але гісторыя надзвычай непрыемная.

У савецкі час рашэнне аб прысуджэнні вучонай ступені на аснове хадайніцтва спецыялізаванага савета прымаў ВАК СССР. Працэдура доўгая і даволі нервовая. Абарона, пасля месяц на афармленне дакументаў, іх перасылка ў Маскву (з усяго Савецкага Саюза), чаканне разгляду (а магчыма, яшчэ і экспертная ацэнка), затым зваротнае падарожжа дакументаў. На ўсё гэта сыходзіў, як правіла, год. Але ступень прысуджалася з дня абароны дысертацыі ў савеце, з гэтага часу налічвалася і адпаведная надбаўка да заробку. За грашовую розніцу, якая назбіралася, трэба было для калег арганізаваць банкет. У мяне ў дакладнасці так і атрымалася, і для банкета я за месяц замовіў магілёўскі рэстаран «Колас». Гэта быў 1983 год, востры дэфіцыт прадуктаў, але пад гэтыя мэты рэстарану выдзяляліся адпаведныя квоты. Узгадніўшы з адміністратарам рэстарана час, колькасць удзельнікаў, меню, я спытаўся, ці трэба ўдакладняць напярэдадні гатоўнасць рэстарана да правядзення банкета. Мне сказалі, што мы ўсё падрабязна абгаварылі, праблем яны не бачаць ніякіх, збірайце праз месяц, у суботу ў 17 гадзін, сваіх гасцей. Усё будзе ў парадку. Але за два дні да вызначанага часу я ўсё ж такі патэлефанаваў адміністратару, каб лішні раз пераканацца ў гатоўнасці рэстарана да майго ўрачыстага мерапрыемства. А яна мне гаворыць:

— Вы ж адмянілі свой банкет! Мы нічога і не гатуем!

Я проста анямеў:

— Як адмянілі? Я ж у вас нават не быў!

— Вы званілі мне па тэлефоне, прадставіліся і сказалі, што па непрадбачаных абставінах банкет адмяняецца.

— І вы на аснове гэтага тэлефоннага званка спынілі падрыхтоўку?

— У нас такая сітуацыя ўпершыню! А вам, Аляксандр Міхайлавіч, я раю болей уважліва вывучыць, хто ў вас у сябрах!

Банкет, зразумела, адбыўся, але я і цяпер не ведаю, хто і чаму так паступіў.

Пераклаў
з рускай мовы
Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 6 жніўня.)

(Працяг.
Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23 ліпеня.)

Сугучча

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ АДПРАВІЛІСЯ ВА УЗБЕКІСТАН

Фонды Цэнтра народнай дыпламатыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ва Узбекістане папоўніліся беларускай літаратурай. Урачыстая цырымонія перадачы кніг адбылася ў межах святкавання 100-гадовага юбілею Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і рэалізацыі міжнароднага праекта «Беларусь сёння». У збор увайшло каля 100 найлепшых літаратурна-мастацкіх, навуковых, навукова-папулярных выданняў, а таксама энцыклапедыі, даведнікі і фотаальбомы нашай краіны. Узбекскаму чытачу калекцыя кніг прадставіць Беларусь ва ўсёй яе разнастайнасці: шматвяковая гісторыя, сучаснае жыццё, культурныя дасягненні і багатыя нацыянальныя традыцыі.

Падчас мерапрыемства **Аксана КНІЖНІКАВА, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,** распавяла, што ў 2010 годзе бібліятэка ініцыявала стварэнне праекта «Беларусь сёння» — ідэя была падтрымана міністэрствамі культуры, інфармацыі і замежных спраў Рэспублікі Беларусь. За 12 гадоў існавання праекта камплекты кніг беларускіх аўтараў былі перададзены Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, нацыянальным бібліятэкам Азербайджана, Арменіі, Турцыі.

— Вядзецца супрацоўніцтва і з Узбекістанам. Мы шчыра спадзяёмся, што перададзеныя кнігі будуць запатрабаваныя, і з задавальненнем уручаем сертыфікат, — дадала Аксана Кніжнікава.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала зваротны падарунак ад Пасольства Рэспублікі Узбекістан. Фонды нашай галоўнай кніжнай скарбніцы папоўніліся калекцыяй з 24 плакатаў з выявамі дзеячаў культуры Узбекістана. Сярод іх — Абдула Арыпаў, Алішэр Наваі, Зульфія, Хамід Алімджан і іншыя. Таксама чытачам будзе даступны збор з 50 выданняў мастацкай прозы і паэзіі класікаў Узбекістана, якія раскрываюць нацыянальныя традыцыі, лад жыцця і быт узбекскага народа. Большасць кніг прадстаўлена на ўзбекскай мове.

Са словам выступіў саветнік Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула Назараў:

— Вельмі прыемна атрымаць такі каштоўны падарунак для нашай краіны. Камплект кніг дазволіць нам бліжэй пазнаёміцца з беларускай культурай, а таксама даведацца аб вашай гісторыі. Я звярнуў

увагу на тое, што і ў Беларусі, і ва Узбекістане людзі шмат чытаюць — гэта сведчыць аб тым, што кіраўнікі нашых краін звяртаюць пільную ўвагу на кнігавыдавецкую дзейнасць.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота дадзена
Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

«СКРЫПКА НАДЗЕІ, СКРЫПКА СВІТАННЯ, ВЕТРУ, ШЫПШЫНЫ І САЛАЎЯ»

Вяселлі ў беларускай літаратуры

Апошні месяц лета, час, калі паспявае ўсё, час збору ўраджаю... Жнівеньскія дні да Успенскага посту лічыліся асабліва добрымі для вяселляў. Праўда, у літаратуры добрыя вяселлі апісваюцца куды радзей, чым пакручастыя гісторыі кахання... Зрэшты, Леў Талстой сцвярджаў, што «апісваць жыццё людзей так, каб абрываць апісанне на жаніцьбе, гэта ўсё адно што, апісваючы падарожжа чалавека, абарваць апісанне на тым месцы, дзе вандроўнік трапіў да разбойнікаў». Калі пісьменнік і паказвае вяселле герояў, дык яно павінна быць незвычайным і сімвалічным... Давайце пагартаем старонкі беларускай класікі і паглядзім, як яе героі бяруць шлюб.

Вяселле на гразкай грэблі

Гераіня мележаўскіх «Людзей на балоце» Ганна Чарнушка выходзіць замуж не па каханні... Пасварылася з мілым сэрцу Васілём Дзятлікам, а тут сватаецца да яе, бяднячкі, праходу не дае багацей Яўхім. Вось і пайшла на злосць...

Мележ пяшчотна любіў роднае Палессе, таму апісанні змовін, падрыхтоўкі да вяселля і самога свята сакавітыя і падрабязныя. Бацька і мачыха Ганны гаруюць: «Разорыць нас вяселле етае! Толькі ж і паддавацца вельмі — сарамата! Зяць такі!..» Падчас вяселля Ганне здаецца, што яна бачыць страшны сон... Аўтар не шкадуе сімвалаў, якія намякаюць, што не да дабра гэты шлюб. У царкву выпраўляюцца «пад віск дудкі, плач гармоніка і буханне бубна», «Ганне кіпуліся ў вочы музыкі ў лапцях, аблепленыя гразёю да кален». А вось на недаробленай грэблі вазы заселі. *«... грязь была пад самымі драбінкамі. Вось-вось на сена, на сядзенне ўспаўзе. І да ўсяго — коні сталі. Як ні грэзіўся, ні сцябаў іх скураной пугай паганяты, як ні пяліся яны, ашалела водзячы вачыма, воз не кранаўся... Калі выпаўзлі на сухое, спыніліся, пасаскоквалі з вазоў. Жмутамі сена, што выцягвалі з-за драбінак, сціралі грязь з конскіх жыватоў і ног, з калёс, чысціліся, прыбіраліся самі. Яўхімавы хлопцы, хто сам не вельмі вырабіўся ў тканні, з рогатам завіхаліся каля Яўхіма: здымалі боты, выкручвалі анучы, абціралі штаны.*

— От дак жаніх! — чулася адтуль іржанне. — Самой Захарысе ў пару! І тая спужалася б!..

Ганне таксама было клопату: хоць пераседзела грэблю на возе, фарбаваную світку і андарак грязь пабіла, нібы шротам...»

Так што чытач разумее: нічога добрага бедную палескую прыгажуню не чакае ў доме багацеяў Глушакоў.

Госці на патэльні

Беларускі пісьменнік-адраджэнец Ядвігін Ш., ён жа Антон Лявіцкі, любіў складаць прыпавесці... Напрыклад, пра тое, як удава-каршуніха выдавала замуж дачку за маладога каршунка. Усіх птушак запрасілі: *«салавейку: ён, калі заядзе, ажно за сэрца хапае,— так яно і трэба на вяселлі! Пару галубкоў: для прыкладу, як маюць жыць маладыя. Сароку — канешне трэба: па ўсёй ваколіцы разнясе, якое важнае было вяселле. Удота...*

— Мамка,— перапыніла маладая, — я памятаю, як ты яшчэ малую мяне накарміла раз удотамі, — надта смярдзючыя яны...

— Маўчы, дурная! — прыкрыкнула на дачку каршуніха.— Маладая ты — не ведаеш яшчэ, як на свеце жыць! Смярдзючы ўдот — то праўда; але калі прыбярэцца дый нашугірыцца, дык іншаму здаецца, што і трэба яму смярдзець: ад важнасці, значыцца. Прасіць і цецерука: у яго такая гутарка, што ніхто яе не разбярэ; вось і будуць думаць, што надта нешта разумнае! У музыкі клікнем дзятла з жаўноў: хай у барабаны таўкуць. Дразда — падсвістваць, бач, майстар. Бухайлу, хоць аддае балотам, але да дуды складзен. На цымбалах добра рэжа бусел, але з ім нам не варта займацца: праз лад ужо насаты».

Баялася птаства да драпежнікаў ісці, хоць тыя і дакляравалі на кіпцюры рукавіцы ўздзець... Але ж як ад такога вялікага гонару адмовіцца?

«І ці дасцё веры: былі там цецярук, дрозд, усе другія, толькі не ў гасцях, а... на скаварадзе!»

Карацей, не хаўрусуйся, просты люд, з панамі і не спадзявайся на іх ласку.

Завяршылася стрэлам

У паэме Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» трое сяброў з падробнымі дакументамі прабіраюцца праз нямецкія тылы на фронт, да сваіх.

«Уваходзім мы смела ў сяло,
Чуем гоман і крыкі,
З вокнаў шлях залівае святло,
Чутны гукі музыкі.
Дакументы ў кішэні ляжаць,
Мы распытваем каля ганку
Аб вяселлі сялянку.
Ладзіць гэта вяселле
Мядзведзкі —
Прыслугач нямецкі.
Ён судзіўся калісь за падпал
Птушкаводчае фермы.
Стаў ён старастам,
хату прыдбаў,
І балюе цяпер ён...
За Мядзведзкага замуж ідзе
Пад пагрозай дзяўчына,
Бо бацькі яе ў лютай бядзе,
Сын — бядзе той прычына.
Камуніст ён.
Мядзведзкі бацькам
Пагражае даносам.
Замуж мусіць пайсці іх дачка
Пад смяротнай пагрозай».

Невясёлае тое вяселле... Вёска аб'явіла байкот, гарманіст іграць адмовіўся... Бацька-скрыпач вымушаны іграць сам.

«Мы на твар маладое глядзім:
Не відно ні крывінкі,
Быццам тут не вяселле зусім,
А памінкі...
Тут па струнах скрыпач
Водзіць светлым
смычком пад прымусам,
Не «лявоніха» сцелецца — плач
Над вясельным абрусам».

Баявітыя госці не змаглі прайсці паўз такую несправядлівасць... Хоць мы так і не даведаемся, адкуль прагучаў стрэл, які пакараў злачыннага жаніха.

Права першай ночы

Сумнае вяселле атрымалася і ў «Беларускай баладзе XV стагоддзя» Янкі Сіпакова, напісанай ад асобы нявесты.

«Што ж ты, дзень мой,
канчаешся хутка, —
Дай хоць промні
твае расчасаць.
Затрымайся яшчэ на мінутку,
Пасвяці мне яшчэ
хоць мінутку, —
Не хачу я цябе адпускаць...»

Так гаруе гераіня... У чым прычына? Выходзіць замуж за каханага, і пачастунак ёсць, і госці пяюць ды скачуць...

«Што ж ты, раніца,
цэдзішся рана?
Ці ў цябе спачування няма?
Бачыш, замуж іду я за Яна —
За раба я выходжу, за Яна,
І рабою раблюся сама».

Такая вось трагедыя: вольная дзяўчына выходзіць замуж за прыгоннага, і на наступны дзень сама страціць волю. Як толькі ўзыдзе сонца, яна, як і муж, зробіцца ўласнасцю пана, які прышле па яе цівуна.

«...І ўжо сонейка ля небакраю
Зашыпела... А што я зраблю?!
Я сама сябе гэтак караю,
І каханнем, і раем караю,
Бо я ж Яна больш волі люблю!»

Калі ўзнік курган

Бралі шлюб і героі Янкі Купалы... Не, не ў знакамітай «Паўлінцы» — там нават сватання толкам не зладзілі. А вось у паэме «Курган», у якой Гусляр кінуў выклік злому князю і быў пахаваны жыўцом, дзеянне адбываецца якраз падчас вяселля.

«Раз бяседа вялікая
ў князя была:
На пасад дачку княжну садзілі;
За сталом він заморскіх
крыніца цякла,
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.

На вяселле-разгул наплыло,
як на сход,
Госці знатных зусюль,
за паўсвету,
Гэткай гучнай бяседы
не помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брыльянтаў,
саетаў!..»

Сапсаваў усё вяселле стары Гусляр, калі замест таго, каб услаўляць маладых, пачаў выкрываць прыгнятальнікаў. Маўляў, «Стол ты ўставіў ядой, косцей шмат пад сталом, — Гэта косці бядноты рабочай».

Дарэчы, пасля жорсткай расправы над Гусляром вяселле працягнулася.

«Толькі княземскі хорам гудзеў,
не маўчаў:
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь
кончыў, пачаў:
Шлюб-вяселле ўсё княжны
гулялі».

Пастка для камара

Максім Багдановіч, які рос далёка ад любай Беларусі, выдатна ведаў беларускі фальклор, не ў апошнюю чаргу дзякуючы бацьку-фальклярысту. У казцы «Мушка-зелянушка й Камарык-насаты тварык» ён па-майстэрску абыграе народны сюжэт пра няўдалую жаніцьбу камарыка. Загубіла яго жонка-лайдачка, хоць вяселле адыгралі як мае быць:

«Авадзень быў камаровым
старшым дружкам,
Рассыпаўся дробным макам
перад мушкай.
Матылькі — баяры,
пчолачкі — баяркі,
Спрытны, шпаркі,
асабліва як да чаркі.
А найстаршая баярачка —
чмяліха
Так спявала,
аж баяр пабрала ліха:
Госці спорна п'юць-ядуць
ды размаўляюць,
А музыкі граюць,
дыхту заўдаваюць...
Нават мёд быў і чмяліны,
і пчаліны.
Хрушч вялізны так гарэлкі насмактаўся,
Што зваліўся ды ў куточку
адсыпаўся.
Восы ў шатах чорных
з жоўтымі стрычкамі,
Проста елі мушку злоснымі
вачамі.
А яна ля мужа сціпленька
сядзела
І зялёненькай спаднічкай
зігацела».

Шлюб як маскіроўка

У рамане Івана Шамякіна «Шлюбная ноч» партызанская разведчыца Валька пакахала маладога чыгуначніка-падпольшчыка Сцяпана... Нават завочна з ім распісалася ў партызанскім атрадзе. Прыйшла наведаць наваспечанага мужа — а ў доме вяселле. Сцяпан жэніцца з іх агульнай знаёмай Машай, прыгажуняй-разведчыцай, прысланай з Масквы. Валька разумее, што вяселле, хутчэй за ўсё, несапраўднае, для маскіроўкі... Але як стрымаць боль, не выказаць рэўнасць? Яна ж выдае сябе тут за Сцяпанаву сястру. Да таго ж сярод гасцей — акупанты, да Валькі залягаецца паліцай...

«Я пайшла да «маладых». Пяць крокаў — ад парога да акна, ля якога яны сядзелі. А здалося, што ішла я даўжэй, чым пяцьдзесят вёрст з атрада да горада. Я ішла на сваё вяселле. І я трапіла на вяселле... Вось ён, мой муж, у чорным касцюме, у беласнежнай сарочцы са смешным гальштукам-бабачкай. Ніколі не паверыла б, што мой Сцяпан начэпіць калі-небудзь такую бабачку. Скажы, калі ласка, які інтэлігент! Але чаму побач з ім замест мяне стаіць у прыгожым белым плацці (пра такое плацце я марыла) гэтая высокая з падмаляванымі бровамі і нафарбаванымі губамі жанчына?... Але не маю я права глядзець на яе так. У яе ўжо і без таго спалоханы твар. А ніхто не павінен палохацца. Ніхто. Ні я. Ні яна. Няхай немцы баяцца нас. А мы любім адна адну. Я люблю цябе, Маша».

Пасля вяселля Сцяпан ідзе падаваць знакі савецкім самалётам, якія бамбяць эшалоны... Яго схопліваюць. Машу арыштоўваюць, калі яна прыкрывае адыход Валькі.

Пад гранне прывіднага музыкі

Героі цудоўнай прыпавесці Уладзіміра Караткевіча «Скрыпка дрыгвы й верасовых пустэчаў» сваё каханне абаранілі. Прыгажуні Марты дабіваўся магнат... Але *«Плюнула яна на ўсё і пайшла за Янука Прынаду, у якога нічога не было, акрамя няновых портак ды старой стрэльбы. А і сама яна выскачыла за яго толькі ў андараку, кофце, ды хусцінцы»:*

На вяселле сваё прыйшлі маладыя ў халупу каля замка. Ніхто болей — пабаяліся, бо ведалі: з'явяцца па маладых ноччу з замка.

«Сядзяць, глядзяць у агонь і смяюцца, як дзеці. Вось і ўсё вяселле. Тут цёпла, а за дзвярыма вецер, і яны трох: Янук, Марта і Каханне».

Раптам з'яўляецца нейкі стары.

«— Сядай бліжэй да агню, — і Янук пасунуў большую груду саломы бліжэй да вогнішча. — Тут табе і цяплей будзе і сушэй. Шкада, што гэта адзінае, чым можам цябе пачаставаць.

— Галодныя, а смеяцёся. Дзірка ў галаве, а ён рагоча.

— А што, каб плакалі, было б лягчэй?

— Ды што гэта ў вас тут? — спытаў сівы ды вусаты.

— Вяселле, бацька».

Аказалася, што госць — знакаміты скрыпач Бан Жвірба, у напеве якога *«чуўся начны прыбой ліп на раздарожжы, спеў верасу пад капытамі баявых коней, песня кахання ў заранцы, шолах азёрных хваль, крык вадзянога бугая ў дрыгве і посвіст ветру ў байніцах разбураных вежаў — усё тое, што ёсць наш край».* І сказаў Бан Жвірба, што будзе ён на гэтым вяселлі іграць. І ўсё навакольле, забыўшыся на страх, сышлося, каб мець магчымасць паслухаць легендарнага

музыку. Маладым нанеслі падарункаў гару... Больш за тое — калі з'явіўся пан з гайдукамі, нічога не змог зрабіць, бо зачаравала яго музыка вялікага скрыпача, і аддаў ён усё золата, што меў пры сабе, і пайшоў.

«І варушылася бузіна на могілках, дзе спачываюць продкі, і сосны шумелі, і чуўся голас:

«Ты чалавек. Ты такі і слабы і смяротны. Шабельны лепшы ўдар песні найгоршай не варты».

Але і гэта яшчэ не ўсё... Калі сышоў Бан Жвірба, Марта і Янук даведаліся, што музыка гэты ўжо месяц як памёр. І прывід іграў ім.

«— Значыць, ён пашкадаваў ваша каханне... нават адтуль, дзе нічога не чуюць».

Хай жа грае для кожнага сапраўднага кахання гэтай зямлі скрыпка дрыгвы й верасовых пустэчаў, пушчу спрадвечных і светлых азёр, і хай на вяселлях гэтай зямлі гучаць спрадвечныя беларускія песні.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ПАД КОЎДРАЙ І Ў ШКАРПЭТКАХ

Як палепшыць свой сон?

Трэць свайго жыцця мы праводзім у сне. І гэты час мусіць быць скарыстаны правільна, каб прыносіць карысць нашаму здароўю і настрою. Аднак часта мы самі парушаем закладзеныя прыродай механізмы. Аднымі з галоўных ворагаў здаровага сну з'яўляюцца стрэс і алкаголь, шкодзяць яму і яркае святло, і цеснае адзенне, і перапоўнены страўнік. Якія правілы мы мусім выконваць, каб не мучыцца ад бяссонніцы? Чым небяспечнае хранічнае недасыпанне? І чаму не трэба ахвяраваць парай гадзін сну дзеля важных спраў? Чаму ў пажылым узросце патрэба ў сне змяншаецца? І чаму наш мозг ніколі не спіць? Пра гэта гутарым з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГАРБАНІДЖАДАМ.

Фота Яўгена ПРАСЕЦКАГА.

— Сон — вельмі складаны і важны працэс для нашага арганізма. Чалавек без ежы можа пражыць даўжэй, чым без сну. Адна з методык катаванняў — не даваць чалавеку спаць. Калі такая бяссонніца доўжыцца некалькі сутак, яна можа прыводзіць да смерці.

— Дарэчы, колькі чалавек можа вытрымаць без сну?

— Каля 7-8 сутак. Вядома, што рэкорд устанавіў амерыканскі школьнік Рэндзі Гарднер, які ў 1964 годзе пратрымаўся без сну больш за 11 сутак. Звычайна ж пасля двух-трох сутак чалавек ужо вельмі дрэнна сябе адчувае.

Многае залежыць ад таго, наколькі інтэнсіўна працуе галаўны мозг. Чым больш ён працуе, тым хутчэй патрабуецца аднаўленне. Ёсць і выключэнні: Леанарда да Вінчы, Бенджамін Франклін, Тэсла спалі па 2-4 гадзіны ў суткі і пры гэтым адчувалі сябе нармальна. Вучоныя лічаць, што з-за пэўнай мутацыі генаў.

Калі падлічыць, то трэць свайго жыцця мы спім. У сярэднім атрымліваецца каля 25 гадоў, і яшчэ сем гадоў выкарыстоўваем для засыпання. Аднак ні ў якім разе гэта не страчаны час. Без сну мы б не маглі паўнацэнна жыць, адчуваць, думаць, кагнітыўныя здольнасці нашага галаўнога мозга былі б не такімі, і нават інтэлект быў бы нашмат горшым.

— Што адбываецца з галаўным мозгам, калі мы спім?

— Памылкова думаць, што падчас сну мозг цалкам адключаецца. Насамрэч у сне ён працуе часам нават больш інтэнсіўна. Наш сон для яго — таксама рабочыя гадзіны, калі ён разбіраецца, як быць з той ці іншай інфармацыяй, якая паступала да нас на працягу дня.

Сон прынята дзяліць на павольную і хуткую фазы. Яны цыклічныя: мы засынаем, і пачынаецца фаза павольнага сну, потым прыходзіць фаза хуткага сну, і яны чаргуюцца. Кожная працягваецца ад 90 да 110 хвілін. Прычым з кожным цыклам фаза хуткага сну падаўжаецца.

Падчас сну мозг перараз мяркоўвае інфармацыю, пазбаўляецца ад таксінаў і іншых рэчываў, якія назапасіліся за дзень, пакуль мы думалі і працавалі, адбываецца некаторая гарманальная перабудова. Усё гэта неабходна, каб мозг адчуваў сябе здаровым. Дарэчы, у людзей, якія мала спяць на працягу жыцця, вышэйшая імавернасць хваробы Альцгеймера, чым у людзей, якія спяць нармальна. Бо калі чалавек мала спіць, у яго запаволены адток таксічных і іншых рэчываў, што з'яўляюцца падчас жыццядзейнасці клетак галаўнога мозга, і гэта шкодзіць яго здароўю.

Той жа самататропны гармон, вядомы як гармон росту, выпрацоўваецца больш за ўсё ў сне, нездарма кажуць, што дзеці ў гэты час растуць, што сапраўды так: чым больш спяць, тым больш растуць.

— Што падчас сну адбываецца з інфармацыяй, атрыманай намі за дзень?

— Калі тлумачыць проста, у нас ёсць два віды памяці: каротка тэрміновая і доўга тэрміновая. На працягу дня мы атрымліваем звонку шмат інфармацыі, і яна стварае новыя нейронныя сувязі, але можа забывацца. А вось падчас фазы павольнага сну мозг пачынае падзяляць важную інфармацыю і няважную. І частка яе пераходзіць з кароткачасовай у доўгачасовую памяць і захоўваецца надоўга. Такім чынам вызваляецца месца для назапашвання новай інфармацыі ў каротка тэрміновай памяці на наступны дзень. І мозгу не трэба зноў ствараць вялікую колькасць новых нейронных сувязяў для кароткачасовай памяці, так ён эканоміць энергію, паводле тэорыі сінаптычнага гемастазу.

— Ці мяняецца ў нас патрэба ў сне ў ходзе жыцця?

— Так, з узростам мяняецца працягласць сну і ссоўваецца час сутак. Маленькія дзеці ўначы спяць 10-12 гадзін, яны любяць рана класціся і, адпаведна, рана прачынацца. І звычайна па выхадных працуюць як будзільнік для сваіх бацькоў. Падлеткі спяць крыху менш — 8-11 гадзін. Ім ужо хочацца класціся пазней і прачынацца ў 9-10 гадзін раніцы. У пажылым узросце час для сну змяншаецца да 6-7 гадзін, гэтага дастаткова, каб адчуваць сябе бадзёра. Хоць часам сталыя людзі і лічаць тое парушэннямі сну, але гэта не так.

— Часам з-за загружанасці і важных спраў даводзіцца ахвяраваць сном. Як уплывае на нас яго скарачэнне на пару-тройку гадзін?

— Калі мы на працягу тыдня змяншаем працягласць сну да 4-6 гадзін у суткі, наш арганізм гэта ўспрымае, як быццам бы мы не спалі двое сутак. А гэта вялікі стрэс. Тым, хто лічыць, што менш паспіць, а днём больш часу застанецца на справы, насамрэч прыходзіцца потым расплачвацца. За тыдзень недахоп сну назапашваецца і прыводзіць да ўпадку сіл і стомленасці. Са сном не трэба змагацца, бо гэта генетычна абумоўлены працэс.

— А ці варта спаць днём?

— Лічыцца, што калі дзённы сон працягваецца не больш як 30 хвілін, ён стымулюе работу галаўнога мозга і павялічвае наш каэфіцыент карыснага дзеяння. У некаторых краінах існуе сіеста, і работадаўцы выкарыстоўваюць гэты прыём, каб павялічыць эфектыўнасць работніка. А вось спаць днём даўжэй за 30 хвілін лічыцца не самай добрай звычкай. У тым ліку і таму, што працяглы дзённы сон парушае начны.

— Ад чаго залежаць нашы санлівасць і бадзёрасць?

— У нашым галаўным мозгу маецца ўнутраны гадзіннік. У яго ёсць два цэнтры: бадзёрасці і сну. І на працягу 24 гадзін кожны з іх перацягвае канат у свой бок. Гэта звязана з работай гармонаў. На цэнтр бадзёрасці працуюць ацэцілхалін, адрэналін і іншыя, на цэнтр сну — таксама шмат гармонаў, галоўны з якіх мелатанін. І ў залежнасці ад таго, які цэнтр больш актыўны, так мы сябе і адчуваем: або «спім», або бадзёрыя.

Самы галоўны гармон для сну — мелатанін. Гэта гармон цемнаты, які выпрацоўваецца пасля шасці гадзін вечара. Натуральна, калі не было электрычнасці і лямпаў, мелатанін пачынаў выпрацоўвацца, калі садзілася сонца. З развіццём цывілізацыі біялагічны гадзіннік крыху збіўся і не заўсёды працуе, як трэба.

Вельмі важныя ў нашым арганізме цыркадныя рытмы, калі наш галоўны гадзіннік у галаўным мозгу з дапамогай мелатаніну звярае сябе з гадзіннікамі ў іншых органах і сістэмах. Гэта своеасаблівая каліброўка галаўнога мозга з перыферычнай нервовай сістэмай і органамі. Трэба разумець, што наш арганізм не працуе ўвесь час на поўную моц. Ад часу сутак залежаць нашы максімальныя і мінімальныя тэмпература цела і артэрыяльны ціск, ступень нашай увагі або рассеянасці і многае іншае. Цыркадныя рытмы супадаюць з пэўным часам сутак і многае вырашаюць: у які час спартсмену лепш трэніравацца, студэнту — вучыцца, на які час прызначаць ваенныя аперацыі. Напрыклад, атакаваць тэрарыстаў лепш у чатыры гадзіны раніцы, калі ў арганізма самая марудная рэакцыя.

«Сон прынята дзяліць на павольную і хуткую фазы. Яны цыклічныя: мы засынаем, і пачынаецца фаза павольнага сну, потым прыходзіць фаза хуткага сну, і яны чаргуюцца. Кожная працягваецца ад 90 да 110 хвілін».

Калі выдзяленне мелатаніну парушаецца, каліброўка ў нашым арганізме адбываецца непаўнацэнна, наш унутраны гадзіннік не можа звярацца, як належыць, і на працягу сутак мы адчуваем сябе разбітымі.

— Што можна зрабіць, каб мелатанін выпрацоўваўся паўнацэнна?

— Як ні дзіўна, сіняе святло вельмі моцна ўплывае на вылучэнне мелатаніну — яго выпрацоўваецца мала. Таму пасля шасці вечара не рэкамендуецца знаходзіцца пры яркім асвятленні, асабліва калі ў ім маюцца сінія колеры. І чым цямней у памяшканні падчас сну, тым больш выпрацоўваецца мелатаніну. Асабліва важна выключыць у спальні сінія лямпачкі і прыборы.

Вельмі моцна на парушэнне фаз сну ўплывае хранічны стрэс. Гэта можа прыводзіць да парушэння сну і патрабуе лячэння з дапамогай антыдэпрэсантаў, заспакаяльных і іншых прэпаратаў. Даводзіць сябе да хранічнага стрэсу не варта, лепш прафілактычна прытрымлівацца рэжыму працы і адпачынку, падчас нейкіх праблем, калі не можам спраўляцца самастойна, варта, параіўшыся з урачом, прымаць заспакаяльныя прэпараты, каб не трапіць у замкнёнае кола. Бо стрэс выклікае парушэнне сну, якое ўзмацняе стрэс, яны адзін аднаго пагаршаюць, і чалавек усё глыбей правальваецца ў дэпрэсію.

— Чым яшчэ небяспечнае хранічнае недасыпанне?

— Паколькі ў сне адбываецца размеркаванне інфармацыі з кароткачасовай у доўгачасовую памяць, калі мы будзем дрэнна спаць, на наступны дзень пагаршаюцца кагнітыўныя здольнасці нашага галаўнога мозга, мы пачынаем горш разважаць. Калі гэта доўга працягвацца, то прыводзіць да хранічнай дэпрэсіі, і без сур'ёзнага лячэння тады не абысціся.

Дрэнны сон можа выклікаць такія хваробы, як атлусценне. Ёсць такая тэорыя, што ў чалавека, які дрэнна спіць, выпрацоўваецца мала гармону шчасця, і за кошт смачнай і высокакаларыйнай ежы ён гэта кампенсуе. Таксама лічыцца, што недахоп сну можа выклікаць цукровы дыябет, зніжаць імунітэт, адсюль часцей магчымыя прастудныя захворванні, абвастраюцца хранічныя і нават узнікаюць анкалагічныя. Хранічны недасып можа прыводзіць да сардэчна-сасудзістых хвароб, асабліва гіпертаніі, і ўплывае на працягласць жыцця. Англічане ўстанавілі, што ў нас каля 500 генаў, якія перыядычна ўключаюцца і выключаюцца. Калі паддоследным зніжалі колькасць сну да 6 гадзін, гэта пачало выклікаць моцныя стрэсавыя сітуацыі і актывацыю тых генаў, якія павялічваюць рызыку развіцця раку і цукровага дыябету.

— Чай і кава ўплываюць на сон?

— У нашым арганізме маюцца адрэналінавыя рэцэптары. Калі мы п'ём чай ці каву, кафеін на гэтыя рэцэптары ўздзейнічае, што і парушае рытмы сну. І ў начны час можа выклікаць бяссонніцу, расстройства страўніка, млоснасць, адчуванне галаўнога болю, пачашчэнне сэрцабіцця і нервознасць. Кафеін выводзіцца з арганізма 4-6 гадзін. Таму, калі мы збіраемся спаць, мінімум за чатыры гадзіны не варта ўжываць каву і чай. У якім з гэтых напояў больш кафеіну, цяжка сказаць, усё залежыць ад моцы і гатунку. Чорны чай утрымлівае каля 50 мг кафеіну, зялёны — 36, белы — 25, капучына — 120, эспрэса — 60, кава без кафеіну — 3. Такім чынам, па ўтрымманні кафеіну адзін кубак эспрэса параўнальны з кубкам чорнага чаю.

— Засынаць варта на галодны страўнік ці лепш павячэраць?

— Страўнік і кішэчнік пачынаюць працаваць, як толькі паступіла ежа, і пакуль не ператравяць яе поўнасцю, не спыняцца. Стравання суправаджаецца пачашчаным сэрцабіццем, узмоцненым кровазваротам у зоне брушной поласці. Таму ў гэты час і сэрца, і галаўны мозг працуюць інтэнсіўна, нягледзячы на тое, што мы спім. Пасля позняй вячэры на наступную раніцу мы адчуваем сябе так, быццам бы спалі вельмі мала. Акрамя таго, познія вячэры выклікаюць лішнюю вагу, бо энергію, якую атрымаў арганізм, варта некуды дзець. Паколькі яна не расходуецца, то адкладваецца ў тлушчавае дэпо.

«У пажылым узросце час для сну змяншаецца да 6-7 гадзін, гэтага дастаткова, каб адчуваць сябе бадзёра. Хоць часам сталыя людзі і лічаць тое парушэннямі сну, але гэта не так».

— Як увогуле рыхтаваць спальню да сну?

— Падчас сну крыху змяншаецца тэмпература цела. І ў прахаладнай спальні спіцца лепш. Таму аптымальная тэмпература — 19-21 градус.

Нягледзячы на тое што лепш зменшыць тэмпературу ў спальні, ногі мы павінны трымаць у цяпле. Для таго каб добра заснуць, можна надзець цёплыя шкарпэткі, але каб яны не пераціскалі ногі і не парушалі кровазварот. Гэта гарантуе глыбокі сон.

Разам з тым лічыцца, што чым цяжэйшая коўдра, тым мацнейшы сон. Пад коўдрай мы адчуваем сябе больш абароненымі, яна выклікае заспакаяльны эфект абдымкаў, мы рэлаксіруем, лепш засынаем і глыбей спім.

Калі падвесці вынік, у норме мы мусім спаць мінімум 7-8 гадзін, за чатыры гадзіны да сну не павінны піць чай ці каву, кока-колу і пепсі-колу, энергетыкі, бо яны таксама ўтрымліваюць кафеін. За 2 гадзіны да сну варта выключыць значную фізічную нагрузку, праветрыць пакой і знізіць тэмпературу. Вітаюцца цёплыя шкарпэткі, коўдра, важна адключыць гаджэты і прыбраць сіні колер. Вельмі важны фактар — начное адзенне. Яно не павінна пераціскаць, націраць швамі і гумкамі, бо гэта ўплывае на выпрацоўку мелатаніну.

Алена КРАВЕЦ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Минский подшипниковый завод», г. Минск, ул. Жилуновича, 2**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона

Незавершенное законсервированное строение – готовность 82 %
(назначение: здание неустановленного назначения, общ. пл. 857,6 кв. м, инв. № 500/U-1026105).
Местоположение: **г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7**

Сведения о земельном участке: пл. **36,8556 га** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 99/100, срок действия по 31.07.2053) для размещения объектов иного назначения. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5060 га), теплоснабжения (пл. 0,2500 га), газоснабжения (пл. 0,0430 га). После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Начальная цена лота с НДС 20 % – 744 902,33 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 3 (три) процента от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 21.06.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 11.08.2022 в 13.00. Окончание торгов: 11.08.2022 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия»
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34)
проводит открытый аукцион по продаже оборудования КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат»
(223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71)
в составе:

Лот № 1:
• административное здание *(составные части и принадлежности: навес, 2 (две) пристройки, забор)* **с инв. № 615/С-16029 общ. пл. 385,2 кв. м.** *Объект обременен договором ипотеки.*
• проходная с инв. № 615/С-16277 общ. пл. 14 кв. м;
• многолетние насаждения (41 шт.).
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003969 *(право постоянного пользования)* **площадью 0,2069 га, по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**
Начальная цена с НДС (20 %) – **192 480,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **19 248,00** бел. руб.).

Лот № 2: автопогрузчик ЛЗА АП-40814, 1989 г. в., инв. № 05-110, находится по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.
Начальная цена с НДС (20 %) – **3 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **300,00** бел. руб.).

Лот № 3: станок сверлильно-присадочный многоголовочный Griggio G65/5T, 2013 г. в., инв. № 99-9, находится по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.
Начальная цена с НДС (20 %) – **9 960,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **996,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Шаг аукциона – 5 процентов.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.
Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
